Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

27 САКАВІКА 2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 57
(26415)

Кошт 600 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Чытач — чытачу

Без газеты, без «Звязды»
Ні туды і ні сюды...
Свежы нумар атрымаю —
І душой адпачываю:
Тут — жыццё маёй краіны,
Тут замежныя навіны,
І калі цыклон ідзе,
Прачытаю я ў «Звяздзе»...
А найбольш, я знаю гэта,
Дарагая мне газета
Родным словам, мовай Маці...
Дык жыві ж... У кожнай хаце!

Гэтымі радкамі Валянціны Францаўны Грыгаровіч з в. Юркаўшчына Докшыцкага раёна мы хацелі нагадаць Вам, што сёння апошні дзень падпіскі — на красавік, на II квартал.

КАЛІ ЛАСКА, ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ!

ДАПАМОГА З НОВЫМ «РАСКЛАДАМ»?

За мінулы год па адрасную сацыяльную дапамогу звярнулася амаль 320 тысяч грамадзян Беларусі, а сама падтрымка была налічана для 287 тысяч чалавек. Прычым, паводле слоў намесніка міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціны Каралёвай, апошняя лічба перавысіла паказчык 2007 года адразу ў 5 разоў.

ЗА «ПАМЫЛКІ» ПАЗБАЎЛЯЮЦЬ ПРАВА

Адначасова ў міністэрстве зазначаюць: рост колькасці атрымальнікаў адраснай сацыяльнай дапамогі не тлумачыцца паніжэннем узроўню забяспечанасці насельніцтва: наадварот, паводле звестак выбарачнага абследавання хатніх гаспадарак, доля грамадзян з даходамі, ніжэйшымі за бюджэт пражыткавага мінімуму, за гэты час знізілася з 7,7 да 6,1 %. Прычына нашмат большай папулярнасці адраснай падтрымкі была іншай: павышэнне «планкі» гарантаванага даходу з 60 да 100 % пры прызначэнні штомесячных і з 60 да 120 % — пры прызначэнні аднаразовых выплат. У сваю чаргу гэта паўплывала і на самі памеры трансфертаў. Летась сярэдні паказчык штомесячнай дапамогі ў параўнанні з 2007 годам узрос больш чым удвая і склаў 57,4 тыс. рублёў на чалавека ў месяц. А памер аднаразовай дапамогі павялічыўся з 82,8 да 124,5 тыс. рублёў на аднаго чалавека ў месяц або з 250 да 337 тысяч — на сярэднюю сям'ю.

Пры гэтым Валянціна Каралёва адзначыла: падтрымка «пайшла» менавіта найбольш бедным сем'ям. Пазалетась адраснай сацыяльнай дапамогай было ахоплена ўсяго 8,4 % маламаёмаснага насельніцтва Беларусі. Летась гэты паказчык павялічыўся да 48,6 %.

Паводле слоў намесніка міністра, было не менш важна, каб адрасныя выплаты атрымалі людзі, якія апынуліся ў складанай сітуацыі па аб'ектыўных прычынах. Для папярэджання нахлебніцкіх настрояў прызначэнне дапамогі рабілася з улікам меркаванняў спецыялістаў сельсаветаў, супрацоўнікаў міліцыі, установ адукацыі і аховы здароўя, сталася практыкай абследаванне ўмоў жыцця прэтэндэнтаў. Гэта дало плён. У цэлым на працягу мінулага года ад сем'яў, якім у адраснай падтрымцы было адмоўлена, паступіла толькі 172 скаргі. Прычым усяго 17 з іх былі прызнаныя абгрунтаванымі. Праблема ў іншым. 244 прэтэндэнты былі пазбаўленыя права на адрасную сацыяльную дапамогу ўвогуле. Падставай для гэтага была падача грамадзянамі сказаных звестак аб складзе сям'і і звестак аб даходах.

КАМУ «ПАЙШЛА» ПАДТРЫМКА?

Збольшага адрасныя выплаты рабіліся шматдзетным сем'ям. Адначасова ў грамадскіх танцавальных мерапрыемствах без суправаджэння дарослай асобы з 24.00 да 5.00.

Таксама ў 12 суб'ектах Расійскай Федэрацыі раней былі прыняты ўласныя эксперыментальныя падобныя законы. Практыка паказала, што злачыннасць сярод няпоўнагадовых у гэтых рэгіёнах істотна знізілася.

— Улічваючы ўсё гэта, — адзначыў Валерый Іваноў, — мы зараз разглядаем пытанне аб магчымасці ўнясення ў Закон РБ «Аб правах дзіцяці» дапаўнення, згодна з якім дзіця да 14 гадоў можа знаходзіцца ў начны час у грамадскіх месцах толькі ў суправаджэнні бацькоў ці іншых законных прадстаўнікоў, поўнагадовых сваякоў, сацыяльных педагогаў школ, класных кіраўнікоў. Пад грамадскімі месцамі разумеем пункты грамадскага харчавання, забаў, усе віды транспарту агульнага карыстання, вуліцы, стадыёны, вакзалы, аэрапорты, скверы, паркі. Пакуль плануем абмежаваць знаходжанне дзяцей да 14 гадоў у грамадскіх месцах без суправаджэння дарослых з 22.00 да 6.00. У Міністэрстве адукацыі перакананы, што праца ўсіх секцый, гурткоў заканчваецца да дзевяці гадзін вечара. Мне здаецца, што гадзіны будзе дастаткова, каб дзіцяці дабрацца дадому.

Ёсць думкі, што меркаваны Закон не будзе абавязковым для ўсіх рэгіёнаў. Бо крымінальная сітуацыя рэзка адрозніваецца ў многіх гарадах і раёнах. Напрыклад, у Бабруйску каэфіцыент злачыннасці няпоўнагадовых ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў амаль у тры разы большы, чым у Жодзіне.

— У адміністрацыйны кодэкс плануем унесці норму аб адказнасці бацькоў за знаходжанне іх дзяцей у начны час у грамадскіх месцах, — падкрэсліў Валерый Іваноў. — Акрамя таго, да адказнасці будуць прыцягвацца індывідуальныя прадпрымальнікі і юрыдычныя асобы сферы грамадскага харчавання і забаў, дзе апынулася падлетак ў забаронены час. Хутчэй за ўсё ў дачыненні ўсіх вышэй згаданых асобаў будуць прымяняцца такія віды адміністрацыйнай адказнасці, як папярэджанне, а за злоснае парушэнне — штраф.

Выяўляць жа такіх безнаглядных падлеткаў будзе міліцыя.

— Але ні масавых аблаў на дзяцей да 14 гадоў, якія будуць знаходзіцца ў забаронены час у грамадскім месцы, ні «каменданцкай гадзіны» ў маштабах усёй краіны меркаваныя змяненні ў заканадаўстве не прадугледжваюць, — адзначыў прадстаўнік Генпракуратуры.

Надзея ДРЫЛА.

«Міністэрства працы і сацыяльнай абароны прапануе павялічыць «планку» аднаразовай сацыяльнай дапамогі з 120 да 150 % ад бюджэту пражыткавага мінімуму, павялічыць тэрмін штомесячнай падтрымкі, а таксама вырашыць пытанні са сродкамі рэабілітацыі для інвалідаў III групы і хворых дзяцей.»

Не менш востры застаецца тэма забеспячэння тымі ж сродкамі рэабілітацыі дзяцей і падлеткаў, якія маюць такую патрэбу па медыцынскіх паказаннях, але інвалідамі не з'яўляюцца. Дапаможныя сродкі тут трэба купляць за ўласныя сродкі. Наколькі ж гэта рэальна, можна меркаваць з наступнага: поўны кошт гарсэта складае 750-800 тыс., а артапедычнага абутку — 250-300 тыс. рублёў. Таму, да прыкладу, за першую палову мінулага года неабходныя сродкі рэабілітацыі былі набытыя толькі для 600 дзяцей з парушэннямі здароўя — гэта склала прыкладна 5 % ад іх агульнай колькасці.

Зрэшты, паведаміла Валянціна Каралёва, зараз Міністэрства працы і сацыяльнай абароны ўжо падрыхтавала свае прапановы па змяненні некаторых умоў аказання адраснай сацыяльнай дапамогі. Зараз прапановы ўзгадняюцца з іншымі міністэрствамі і ведамствамі. Прычым у тым ліку гаворка ідзе аб гарантаванні інвалідам III групы і дзецям ва ўзросце да 18 гадоў права атрымліваць неабходныя дапаможныя сродкі бясплатна.

Прапанова нумар два — аб'яднаць адрасную сацыяльную дапамогу і сістэму бязнаяўных жыллёвых субсідый. З цягам часу апошнія могуць знікнуць.

Пры гэтым Міністэрства працы і сацыяльнай абароны мае намер замацаваць новы «крытэрый патрэбы» пры прызначэнні аднаразовай адраснай сацыяльнай дапамогі і павысіць яго з цяперашніх 120 да 150 % бюджэту пражыткавага мінімуму. «Планка» штомесячнай дапамогі застанецца без змянення. Разам з тым плануецца ініцыяваць павелічэнне тэрміну штомесячных выплат — з 3 да 6 месяцаў. Прычым мяркуецца вызначаць права на адрасную падтрымку, зыходзячы з даходаў за 12 месяцаў, што папярэднічаюць звароту за ёй.

Адначасова прапануецца змяніць парадак уліку даходаў прэтэндэнтаў — тут плануецца выкарыстоўваць каэфіцыенты ўліку эфекту ад сумеснага пражывання для сем'яў, якія складаюцца з двух і больш чалавек. Нарэшце, міністэрства лічыць патрэбным увесці дадатковыя абмежаванні на адрасныя выплаты для асобных грамадзян. У прыватнасці, маюцца на ўвазе грамадзяне, якія за 12 месяцаў перад зваротам па падтрымку набылі транспартны сродак (за выключэннем сем'яў з дзецьмі-інвалідамі, інвалідамі I і II груп, шматдзетных сем'яў), а таксама асобы, якія без аб'ектыўных на тое прычын працуюць у рэжыме няпоўнага часу.

Сяргей ГРЫБ.

«КІРМАШ ВАКАНСІЙ»:

У МІНСКУ НАЙБОЛЬШ ЗАПАТРАБАВАНЫЯ СПЕЦЫЯЛІСТЫ ПРАМЫСЛОВАЙ СФЕРЫ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

«Інтэграл», «Мінскі электрамеханічны завод», «Мінскрамбуд», «Белліфт», БДЭУ — пералік прадпрыемстваў, якія шукалі патэнцыйных працаўнікоў на «Кірмашы вакансій», можна весці доўга. Асноўныя прафесіі, які патрабуюцца сёння на мінскіх прадпрыемствах, — гэта токары, слесары-рамонтнікі, будаўнікі, наладчыкі, ліфцёры і г.д. А таксама прадаўцы, грузчыкі, прыбіральшчыкі, медсёстры і санітаркі. Пераважна «мужчынскія» спецыяльнасці, кола прафесій для жанчын не такое ўжо і вялікае: прадаўцы, бухгалтары, прыбіральшчыцы.

— Сёння ў кірмашы ўдзельнічаюць 94 прадпрыемствы. Амаль усе мінскія — прамысловыя, гандлёвыя, будаўнічыя..., — расказвае **Ала ПУЧКО, спецыяліст камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама.** — Заработная плата на гэтых прадпрыемствах ад 600 тыс. рублёў да 1,5 млн. Усё залежыць ад кваліфікацыі і разраду спецыяліста. Мінулай вясной нас наведала каля 3000 чалавек, з іх 7 працэнтаў іншагародніх. У асноўным — мужчыны, іх летась — дзве трэці. У адрозненне ад статыстыкі па беспрацоўі: на ўліку стаяць пераважна жанчыны. Канкрэтна на прадпрыемствы звярнулася каля 20 працэнтаў наведвальнікаў. Пятая частка ад тых, хто звярнуўся, была ўладкаваная. Гэта значыць вынік і эфект ад кірмашу ёсць.

Віталь, студэнт 4 курса БНТУ:

— Я хачу знайсці працу інжынера-праграміста ў сферы інфармацыйных тэхналогій. Вось ужо месяц шукаю праз знаёмых, па аб'явах у інтэрнэце, газетах. Пакуль што ніяк. На кірмашы ўпершыню. Пакуль што не вельмі ўдала. Тут патрабуюцца аператары ПК і 1С-бухгалтэрыі. А так, каб па маёй спецыяльнасці, пакуль што не знаходжу.

Алеся і Вольга, студэнткі 4 курса БДПУ імя М. Танка:

— Мы шукаем працу ў сацыяльнай сферы. Таму што адукацыю атрымліваем адпаведную. У прынцыпе, ёсць такая нядрэнная пасада — кіраўнікі гурткоў, а таксама педагог-арганізатар, сацыяльны педагог. Паколькі стажу ў нас амаль няма, разлічваем на зарплату ад 500-600 тыс. У прынцыпе, можна знайсці працу тут. Але вакансіі ў асноўным «мужчынскія», жанчынам досыць складана.

Андрэй КАЖАН, намеснік дырэктара філіяла «Электрамантажбуд» ААТ «Мінскрамбуд»:

— Нам патрабуюцца будаўнічыя спецыяльнасці, заработная плата залежыць ад таго, колькі зробіш. Можна атрымаць 800 тыс., а можна і 2 млн. Мы ўжо другі раз на кірмашы. Летась да нас звярнулася пяць чалавек, з іх толькі двое засталіся.

Таццяна МАЎЦЯН, інжынер па падрыхтоўцы кадраў філіяла РУП «Мінскэнерга» «Мінскія кабельныя сеткі»:

— Нашаму прадпрыемству патрэбны электраманцёры і вадзіцелі. На «Кірмашы вакансій» мы не першы раз. Многія нашы працаўнікі прыйшлі да нас пасля мінулых удзелаў. Безумоўна, такія мерапрыемствы вельмі спрыяюць працадаўцам і тым, хто шукае працу.

«Кірмашы вакансій» праходзяць два разы ў год: восенню і вясной. Тут можна за некалькі гадзін абысці каля сотні працадаўцаў. А таксама атрымаць бясплатную юрыдычную кансультацыю па ўсіх пытаннях працоўнага заканадаўства, даведацца, дзе і як шукаць працу.

Такія кірмашы створаны ў першую чаргу для беспрацоўных грамадзян, якіх у сталіцы 4 700 чалавек.

Настасся ЗАНЬКО.

Прамыя лініі

АНКАЎРАЛОГІЯ І АНКАГІНЕКАЛОГІЯ

Дыягностыка і лячэнне анкалагічных захворванняў, у прыватнасці, анкаўралагічных (прастата, мачавы пузыр, ныркі) і анкагінекалагічных (рэпрадуктыўная сістэма жанчын) будуць у цэнтры ўвагі нашай чарговай «прамой лініі» па медыцынскай тэматыцы. На вашы пытанні адкажуць спецыялісты Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава — **намеснік дырэктара па навуковай працы, доктар медыцынскіх навук Сяргей Анатольевіч КРАСНЫ** і **загадчыца аддзела анкагінекалогіі, доктар медыцынскіх навук Ірына Аляксандраўна КАСЭНКА.** «Прамая лінія» адбудзецца 30 сакавіка, у панядзелак, з 14.00 да 15.00 па нумарах 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92.

Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах 8 (017) 287 18 29 (Святлана Барысенка) і 287 18 36 (Вольга Шаўко).

УСЁ ПРА РАЗМЕРКАВАННЕ

Размеркаванне — не менш адказны час у жыцці маладых людзей, чым прыёмная кампанія. Ці абавязана камісія па размеркаванні задавальняць персанальныя заяўкі арганізацый на выпускніковую? Ці павінна брацца пад увагу сямейнае становішча выпускніка? Якія прывілеі дае выпускнікам статус маладога спецыяліста? Якія могуць быць падставы для перазмеркавання? Ці можна апратэставаць вынікі размеркавання? Як размяркоўваюцца выпускнікі магістратуры? На ўсе пытанні, якія датычацца забеспячэння маладых людзей першым працоўным месцам і працы па размеркаванні, вам адкажуць **старшыня Рэспубліканскага савета старшыняў прафсаюзных камітэтаў навучэнскай моладзі пры Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, намеснік старшыні ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Раман ДАПІРА** і **галоўны прававы інспектар працы ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Ларыса МАНЮК,** з якімі «Звязда» арганізуе завочную «прамую» лінію.

З пытаннямі можна звяртацца ў рэдакцыю па нумары (017) 287 17 41 (Надзея НІКАЛАЕВА).

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

ДЗВЕ АВАРЫІ НА ПЕРАЕЗДЗЕ

У Мінскім раёне раніцай 25 сакавіка на неахоўваемым чыгуначным пераезде на станцыі «Міханавічы» адбылося сутыкненне электрычкі, якая ішла па маршруце Асіповічы — Мінск, з аўтамабілем «Сітраён».

У аўтамабілі пасажыраў не было, а вадзіцель з выцятымі мяккімі тканкамі цемянной вобласці галавы быў дастаўлены ў лячэбную ўстанову. Затрымка ў руху электрацягніка склала 5 хвілін. 26 сакавіка ў 00.07 у Смалявіцкім раёне на ахоўваемым пераезде «Смалявічы — Чырвоны сцяг» з аўтамабілем «Додж-Караван» сутыкнуўся пасажырскі цягнік № 78, які рухаўся па маршруце Гродна — Масква. Вадзіцель 1975 года нараджэння загінуў на месцы здарэння. Затрымка ў руху цягніка склала 2 гадзіны 30 хвілін.

Ул. інф.

ЦЕПЛЫНЯ НА ФОНЕ ДАЖДЖОЎ

Яшчэ сёння ў Брэсцкай і Гродзенскай абласцях будзе мокры снег і дождж, паведаміла рэдакцыі **галоўны сіноптык Рэспубліканскага гідраметцэнтра Вольга ФЯДОТАВА.** Ужо ў выхадныя на большай частцы тэрыторыі Беларусі будуць ісці выключна дажджы. Тэмпература сёння ўдзень 1—7 цяпла. Істотна цяплець пачне ў суботу, калі ўначы будзе ўжо ад мінус 4 да плюс 2, удзень — 2—9 цяпла, у Брэсцкай вобласці да плюс 11. Уначы на нядзелю тэмпература павялічыцца да 0—плюс 6, удзень будзе трымацца ад 4 цяпла па поўначы да плюс 13 на поўдні Беларусі. У першыя дні наступнага тыдня ў многіх раёнах зноў чакаецца дождж. Тэмпература ўначы ад мінус 3 да плюс 5, удзень — 3—8 цяпла, па поўдні да плюс 10—11. Сіноптыкі ўпэўнены, што стабільнае сапраўды цёплае надвор'е ўсталюецца на тэрыторыі Беларусі толькі ў першыя дні красавіка.

Сяргей КУРКАЧ.

«САЛОДКА» ЖЫЦЬ СТАНЕ ДАРАЖЭЙ — 2210 РУБ. ЗА КІЛО

У краіне ў сярэднім на 5% з 28 сакавіка павысяцца фіксаваныя рознічныя цэны на цукар-пясок для рэалізацыі насельніцтву і мінімальныя адпускныя цэны для рэалізацыі цукру на прамысловую перапрацоўку, паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў прэс-службе Міністэрства эканомікі.

Новыя рознічныя цэны на цукар-пясок вагавы, што ўпакаваны ў мяшкі па 50 кілаграмаў (ДАСТ 21-94), складуць 2 тысячы 30 рублёў за 1 кілаграм, на цукар, расфасаваны ў поліэтыленавыя ці папяровыя пакеты па 1 кілаграме, — 2210 рублёў. Кошт цукру-пяску прасаванага, які расфасаваны ў кардонкі па 1 кілаграме, складзе 2390 рублёў.

У міністэрстве зазначылі, што ўзровень цэнаў на цукар у Беларусі не зменяўся з леташняга жніўня. Цяперашняе павышэнне кошту салодкага прадукту зроблена на прапанове канцэрна «Белдзяржхарчпрам» з мэтай кампенсацыі выдаткаў на вытворчасць.

Ігар ГРЫШЫН.

НУ І НУ!

СЕНСАЦЫЯ: УКРАЛІ КНІГІ!

Што толькі ні кралі зладзеі ў Веткаўскім раёне: і алюмініевыя каструлі, і тазы, і жалезабетонныя слупы, і кароў, і прадукты харчавання — але такога яшчэ не было. Ды не толькі тут, а і ў іншых раёнах Гомельшчыны.

А менавіта — з Радужскай сельскай бібліятэкі ноччу зніклі... 464 кнігі. У міліцыі мяркуюць: напэўна, «інтэлектуал»-злодзей ну ніяк не можа ўявіць сваё жыццё без мастацкай і навуковай літаратуры...

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ПАКАТАЛАСЯ НА 3,5 МЛН

Пенсіянерка ў Баранавічах выплаціць Br3,5 млн за ваджэнне аўтамабіля ў п'яным выглядзе, паведамілі ў пракуратуры Брэсцкай вобласці.

Прыгавор пенсіянерцы вынесены судом Івацэвіцкага раёна за паўторнае на працягу года кіраванне аўтамабілем у стане алкагольнага ап'янення, удакладнілі ў ведамстве.

ЗАРОБКІ ЎНІЗ — ПЕНСІЯ НА МЕСЦЫ

Час і памер наступнага павышэння працоўных пенсій сёлета будуць вызначацца з улікам магчымасцяў эканомікі. Аб гэтым паведаміла **намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Валянціна КАРАЛЁВА.** Згодна з заканадаўствам, перыядычнасць індэксацыі пенсій павінен рабіцца ў выпадку росту сярэдняй па краіне зарплаты на 15 % адносна квартала папярэдняга павышэння. Пакуль гэты «парог» не перавышаны. І больш за тое: апошнім часам у краіне адзначаецца зніжэнне паказчыкаў заробкаў. Разам з тым намеснік міністра падкрэсліла: прынамсі адно павышэнне працоўных пенсій сёлета абавязкова будзе. Адначасова, зазначыла Валянціна Каралёва, пакуль у краіне не прапрацоўваецца пытанне павелічэння дапамогі па беспрацоўі.

Сяргей ГРЫБ.

ПРАЯЗНЫ — ПА МЕСЦЫ НАВУЧАННЯ

У Беларусі не плануецца разглядаць пытанне аб вяртанні льгот на праезд у транспарце навучэнцам і студэнтам — паведаміла **галоўны інспектар упраўлення сацыяльнай і выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Таццяна СІМАНОЎСКАЯ.** На гэты момант магчыма аказанне матэрыяльнай дапамогі на праезд студэнтам і навучэнцам, якія па яе звяртаюцца, праз установы адукацыі з улікам сукупнага даходу. Колькасць такіх зваротаў па праязныя на практыцы невялікая: у сярэднім каля 10 выпадкаў на ВНУ ў месяц. Разам з тым, змяненне цяперашняга парадку не прадбачыцца.

Сяргей ГРЫБ.

НЕ ХАДЗІЦЕ, ДЗЕЦІ, НОЧКАЮ ГУЛЯЦЬ,

але ні масавых аблаў на дзяцей да 14 гадоў, ні «каменданцкай гадзіны» не будзе

Пра магчымасць увядзення абмежавання на знаходжанне няпоўнагадовых у вячэрні і начны час у грамадскіх месцах без бацькоў ужо можна пачуць размовы на вуліцах горада. Людзей хвалюе пытанне, ці будзе прыняты закон аб адказнасці бацькоў?

Пакуль што пытанне, звязанае з магчымасцю ўвядзення адказнасці бацькоў за знаходжанне іх дзяцей у начны час у грамадскіх месцах без нагляду, знаходзіцца на стадыі распрацоўкі, паведамілі ў Генеральнай пракуратуры.

— Да распрацоўкі гэтага пытання нас падштурхнула трывожная статыстыка, — адзначыў **начальнік аддзела па справах няпоўнагадовых і моладзі Генеральнай пракуратуры Беларусі Валерый ІВАНОЎ.** — Летась амаль 500 няпоўнагадовых у цёмны час сутак сталі ахвярамі злачынстваў як аднагодкаў, так і дарослых злачынцаў.

Адсюль вынікае вострая неабходнасць абараніць дзяцей ад правапарушэнняў, якія здзяйсняюцца ў начны час.

— Актыўна вывучаем вопыт іншых краін у гэтай сферы, — паведаміў Валерый Рыгоравіч. — Напрыклад, у 2003 годзе ў Германіі быў прыняты Закон «Аб ахове моладзі». Ён не дазваляе дзецям і падлеткам ва ўзросце да 18 гадоў знаходжанне ў месцах грамадскага харчавання, а таксама ўдзельнічаць у забаронены час у грамадскіх танцавальных мерапрыемствах без суправаджэння дарослых.

ПАЗДРАЎЛЕННІ

Ад усяго сэрца віншуем з 80-годдзем Ніну Іванаўну ЛЕЎКОВІЧ, з 75-годдзем Ніну Іванаўну ЛЕЎКОВІЧ, з 70-годдзем Ніну Іванаўну ЛЕЎКОВІЧ, з 65-годдзем Ніну Іванаўну ЛЕЎКОВІЧ, з 60-годдзем Ніну Іванаўну ЛЕЎКОВІЧ, з 55-годдзем Ніну Іванаўну ЛЕЎКОВІЧ, з 50-годдзем Ніну Іванаўну ЛЕЎКОВІЧ, з 45-годдзем Ніну Іванаўну ЛЕЎКОВІЧ, з 40-годдзем Ніну Іванаўну ЛЕЎКОВІЧ, з 35-годдзем Ніну Іванаўну ЛЕЎКОВІЧ, з 30-годдзем Ніну Іванаўну ЛЕЎКОВІЧ, з 25-годдзем Ніну Іванаўну ЛЕЎКОВІЧ, з 20-годдзем Ніну Іванаўну ЛЕЎКОВІЧ, з 15-годдзем Ніну Іванаўну ЛЕЎКОВІЧ, з 10-годдзем Ніну Іванаўну ЛЕЎКОВІЧ, з 5-годдзем Ніну Іванаўну ЛЕЎКОВІЧ, з 1-годдзем Ніну Іванаўну ЛЕЎКОВІЧ, з 0-годдзем Ніну Іванаўну ЛЕЎКОВІЧ.

На падтрымку адоранай моладзі ў 2009 годзе спецфонду Прэзідэнта Беларусі выдзелена Br1,1 млрд

Адпаведнае распараджэнне Аляксандр Лукашэнка падпісаў 26 сакавіка. Кіраўнік дзяржавы таксама зацвердзіў рашэнне савета спецыяльнага фонду Прэзідэнта. Грашовымі прэміямі з уручэннем нагруднага знака лаўрэата фонду заахвочаны 32 навучэнцы — пераможцы міжнародных алімпіяд і конкурсаў 2008 года. Заахвочвальныя прэміі па выніках 2007/2008 навучальнага года прысуджаны педагагічным і навуковым работнікам, якія ўнеслі асаблівы ўклад у развіццё здольнасцяў адораных навучэнцаў і студэнтаў.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

Уладзімір Макей абмеркаваў з дэпутатамі Бундэстага ўдзел Беларусі ў праграме «Усходняе партнёрства»

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей сустрэўся з дэлегацыяй дэпутатаў Бундэстага (парламент ФРГ) на чале з намеснікам старшыні парламенцкай фракцыі ХДС/ХСС Андрэасам Шокенхофам. У час сустрэчы бакі абмеркавалі стан беларуска-германскага палітычнага дыялога і эканамічнага супрацоўніцтва. З парламентарыямі ФРГ «адбыўся грунтоўны абмен думкамі па комплексе пытанняў, звязаных з працэсам выбудоўвання адносінаў Беларусі з Еўрапейскім саюзам, а таксама беларускага ўдзелу ў праграме ЕС «Усходняе партнёрства». У прыватнасці, было адзначана, што апошнім часам дыялог Мінска з Бруселем набыў устойлівы і прагматычны характар.

БЕЛТА.

Інавацыйныя праекты павінны быць выкананы ў поўным аб'ёме

З шэрагам інавацыйных праектаў азнаёміўся прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі, наведаўшы ўчора адкрытыя акцыянерныя таварыствы «Гродна-Хімвалакно» і «Малочны свет».

У прыватнасці, для гродзенскіх хімікаў вельмі важны інвестыцыйны праект па рэканструкцыі вытворчасці корднай і капронавай ніткі, паэтапную рэалізацыю якога плануецца завяршыць у 2013 годзе. Шынны корд будзе адпавядаць сусветнаму ўзроўню. А ў ААТ «Малочны свет» ўкараняецца актуальная для ўсёй малочнай прамысловасці Беларусі нанатэхналогія пры вытворчасці такога каштоўнага прадукту як сыроватка.

Прэм'ер-міністр адзначыў, што ў прадпрыемстваў, асабліва машынабудаўнічага і хімічнага комплексу, і не толькі беларускіх, сёння шмат вельмі сур'ёзных праблем. Задача ў тым, каб застацца на рынках, гандляваць прадукцыяй і атрымліваць сродкі ад экспартных паставак. Калі браць Гродзеншчыну, то ў цэлым за сакавік выраблена прадукцыі ў аб'ёме каля 420 мільярдаў рублёў, а прададзена ў гэтым месяцы будзе прыкладна на 400 мільярдаў рублёў. Такім чынам, на думку кіраўніка ўрада, пасля складаных тэндэнцый лістапада мінулага — студзеня гэта года ідзе пэўнае ажыўленне рынку.

— У гэтых умовах трэба падтрымаць эканоміку. І галоўнае — падтрымаць інавацыйнымі праектамі, — падкрэсліў Сяргей Сідорскі. — Перадавыя тэхналогіі нават ва ўмовах фінансавага крызісу дазваляюць значна больш упэўнена адчуваць сябе на знешніх рынках. Таму інавацыйныя праекты павінны быць у поўным аб'ёме выкананы. Ужо сёлета мы два трыльёны рублёў, прадугледжаных інавацыйнымі фондамі, накіруем на далейшае развіццё эканомікі, укараненне новых тэхналогій. Гэта будзе значная падтрымка ва ўмовах фінансавага крызісу.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

ДОМА І СЦЕНЫ ДАПАМАГАЮЦЬ

Антыкрызісная эканоміка

Сёлета ў лепшым становішчы апынуліся тыя прадпрыемствы, якія працуюць на ўнутраны рынак і задавальняюць патрэбы айчыннага спажыўца. Аб гэтым, а таксама аб асабліва сцях эканамічнага развіцця краіны ў 2009 годзе і першачарговых захадах, якія робяцца для пераадолення наступстваў глабальнага фінансавага крызісу, у прыватнасці, мерах па падтрымцы рэальнага сектара, паведаміў на прэс-канферэнцыі намеснік міністра эканомікі Анатоль ФІЛОНАЎ.

Ён адзначыў, што праграмна-мэтавы падыход, які яшчэ раней быў закладзены ў аснову развіцця эканомікі нашай краіны, спрыяў таму, што наступствы глабальнага фінансавага крызісу ў Беларусі не такія адчувальныя як у іншых дзяржавах СНД. Хаця праблемы, якія ўзніклі ў сувязі з крызісам, былі ў многім тыповыя і аднолькавыя як для Беларусі, так і для іншых краін, бо наша эканоміка адкрытая і арыентаваная на экспарт. Больш за ўсё пакуль ад крызісу ў нас пацярпелі такія галіны, як машынабудаванне і металаапрацоўка. У студзені-лютым там зарэгістравана падзенне вытворчасці на 20%. Пераважна па прычыне таго, што ўзніклі сур'ёзныя праблемы ў аўтапраме Расіі, прадпрыемствах Украіны.

Па звестках А. Філонава, у Расіі выпуск аўтамабіляў скараціўся на 50-70%, Калі раней такі гігант, як КамАЗ, штомесяц збіраў 5200 машын, то цяпер толькі 850 адзінак. У студзені заводскі канвеер увогуле быў спынены. Аналагічная цяжкая сітуацыя і на АўтаВАЗе, дзе былі вымушаны таксама выключаць канвеер. Вядомы завод ГАЗ амаль утрая знізіў выпуск сваёй прадукцыі: з 18000 да 6000 аўтамабіляў. І такіх прыкладаў шмат. Адсюль і праблемы з рэалізацыяй тавараў беларускіх вытворцаў, якія пастаўляюць свае камплектныя часткі, агрэгаты і іншыя вырабы на расійскія заводы. Намеснік міністра таксама звярнуў увагу на значнае падзенне вытворчасці ў лясной і лесаапрацоўчай галіне (мінус 21,3 %), прамысловасці будаўнічых матэрыялаў і лёгкай прамысловасці (да мінус 16 %). Адна з відавочных і адмоўных праяў крызісу — павелічэнне запасаў гатовай прадукцыі на складах. Асабліва вялікае затаварванне назіраецца ў названых вышэй галінах.

У меншай ступені крызіс, па словах А. Філонава, закрануў галіны, якія арыентаваны на забеспячэнне ўнутранага спажывецкага попыту. На іх прадпрыемствах з пачатку года нават дасягнуты пэўны рост выпуску прадукцыі.

Сёлета істотна скараціўся аб'ём знешняга гандлю, які ў параўнанні са студзенем мінулага года склаў крыху больш за 60%, на 26,6% адбылося фізічнае скарачэнне аб'ёмаў нашага экспарту. На 25,6 % сёлета знізіліся экспартныя цэны. Праўда, амаль на 17% патаннеў імпарт.

На жаль, істотна пагоршыліся фінансавыя паказчыкі дзейнасці айчынных прадпрыемстваў, рэнтабельнасць прамысловасці знізілася ўдвая. У студзені 17,8 прадпрыемстваў спрацавалі са стратамі. Абвастрыліся і фінансавыя праблемы, напрыклад, назіраецца дасяг пратэрмінаваных даўгоў — дэбіторская запазычанасць павялічылася больш чым на 38%. Наўрад ці сёлета гандлёвы абарот дасягне ўзроўню 2008 года — больш за 70 мільярдаў долараў ЗША.

Па словах А. Філонава, урадам краіны прадпрымаюцца актыўныя антыкрызісныя меры. Яны накіраваны на падтрыманне банкаўскай ліквіднасці і ўдасканаленне бюджэтнай палітыкі, на забеспячэнне стабільнай работы валастваральных і іншых прадпрыемстваў рэальнага сектара эканомікі ўключаюць меры па лібералізацыі эканамічнага жыцця. Апошнія маюць на мэце ўзняць у малых гарадах і вёсках ролю і вагу малага бізнэсу ў нашай эканоміцы, садзейнічаць стварэнню новых працоўных месцаў. Зараз рыхтуюцца праекты новых указаў Прэзідэнта, урадавыя дакументы, якія будуць садзейнічаць павышэнню канкурэнтаздольнасці тавараў нашых вытворцаў, зніжэнню запасаў гатовай прадукцыі.

Таксама наладжана ўзаемадзеянне з расійскім бокам па сумеснай барацьбе з крызісам, прыняты адпаведны план. У ім прадугледжваецца выкарыстанне расійскага рубля пры вядзенні знешнеэканамічных здзелак прадпрыемстваў Беларусі і Расіі. Асабліва плённае і мэтанакіраванае супрацоўніцтва ідзе па лініі рэалізацыі праграм Саюзнай дзяржавы.

А. Філонаў зрабіў асцярожны прагноз наконт вынікаў работы нашай эканомікі за першыя тры месяцы гэтага вельмі няпростага года. Ёсць усе падставы спрацаваць у першым квартале з плюсам у Белнафтахіма, Белбіяфарма, прадпрыемстваў харчовай галіны і некаторых іншых.

Канчатковая ацэнка рабоце беларускай эканомікі ў першым квартале будзе дадзена на нарадзе ў кіраўніка дзяржавы, паведаміў намеснік міністра.

Леанід ТУГАРЫН.

Бары, рыбныя крамы і грамадскія прыбіральні ў цэнтры Мінска працуюць з парушэннямі

Генеральная пракуратура Рэспублікі Беларусь правяла шэраг праверак прадпрыемстваў і ўстаноў, якія займаюцца грамадскім абслугоўваннем насельніцтва і якія размешчаны ў жылых дамах у цэнтры сталіцы. У выніку амаль ва ўсіх выяўлены шэраг парушэнняў — ад неадпаведнасці санітарным нормам да парушэння рэжыму працы, вызначанага заканадаўствам. Па выніках праверкі Генеральная пракуратура накіравала прадпісанне ў Мінгарвыканкам аб навядзенні парадку ў такіх установах, паведаміла старшы пракурор аддзела па наглядзе за выкананнем правоў і свабод грамадзян Марына ПАПОВА.

Падставай для праверкі паслужыла калектыўная скарга жыхароў дома №1 па вуліцы Раманаўская Слабада ў сталіцы, у падвале якога працавала кавярня-бар. Жыхары скардзіліся на пах у кватэрах ад ежы, якая гатавалася ў кавярні, на шум (установа зачынялася ў гадзіну ночы) і вялізную колькасць смецця ў дварэ дома, якое вывозілася нерэгулярна. Кавярня-бар была зачынена. Кіраўнік аштрафаваны на 10 базавых велічынь, уладальнік — за арганізацыю гэтага прадпрыемства — на 20 базавых велічынь. У кавярні адазвана ўзгадненне рэжыму працы да гадзіны ночы — цяпер яна будзе зачыняцца ў 23 гадзіны.

Рэжым працы не адпавядае заканадаўству ў многіх установах грамадскага абслугоўвання, размешчаных у жылых дамах у цэнтральнай частцы сталіцы. Неаднаразова скардзіліся жыхары аднаго з дамоў па вуліцы Маскоўскай, дзе кавярня працуе да 5 гадзін раніцы. Адміністрацыя Кастрычніцкага раёна Мінска выдала ўзгадненне рэжыму працы з парушэннем заканадаўства. На трох цэнтральных вуліцах сталіцы — шэраг такіх устаноў, якія працавалі да 5 гадзін раніцы. Зараз Мінгарвыканкам на працягу месяца павінен навесці парадак у грамадскіх установах, размешчаных у жылых дамах.

Праверка выявіла і размяшчэнне рыбных, садавінна-гароднінных, будаўнічых крамаў, і крамаў гастараваў у жылых дамах, а таксама грамадскіх прыбіральняў (па вул. Камсамольская і вул. Леніна), што не адпавядае Будаўнічым нормам Рэспублікі Беларусь. «У Генеральнай пракуратуры няма пазіцыі абавязкова ліквідаваць названыя ўстановы і прадпрыемствы. Але яны працуюць з парушэннем заканадаўства, бо мы пастаянна атрымліваем скаргі жыхароў». Пракурорам абласцей таксама даручана вывучыць законнасць працы прадпрыемстваў і ўстаноў, размешчаных у жылых дамах абласных цэнтраў і іншых гарадоў.

Алена КРАВЕЦ.

УСЕ ЗАДАННІ ЦТ— ПА ШКОЛЬНАЙ ПРАГРАМЕ

Аб гэтым паведаміў міністр адукацыі Аляксандр Радзькоў. «Усе тэсты распрацоўваліся строга ў рамках школьнай праграмы». Разам з тым яны змяшчаюць заданні рознай ступені цяжкасці.

БЕЛТА.

Абзац

■ Міліцыянер выратаваў жанчыну ад зграі бяздомных сабак у Мінску. Супрацоўніца аднаго са сталічных ЖЭСаў каля васьмі гадзін вечара вярталася дамоў і вырашыла скараціць дарогу праз лесапаласу ў раёне вуліцы Уручскай, дзе на яе і напала зграя бяздомных сабак. Крыкі аб дапамозе пачуў міліцыянер батальёна міліцыі Мінгарупраўлення Дэпартамента аховы МУС. Міліцыянер адагнаў сабак, аказаў першую медыцынскую дапамогу пацярпелай і выклікаў брыгаду хуткай дапамогі. Пацярпелая са шматлікімі ранамі ад укусаў на канечнасцях, спіне і галаве змешчана ў хірургічнае аддзяленне 5-й гарадской бальніцы.

■ **На платнай аснове ў ВНУ Беларусі навучаюцца каля 50 % студэнтаў, у сярэднеспецыяльных навучальных установах — 35 % навучэнцаў.**

■ Прамысловыя прадпрыемствы Беларусі будуць адпускаць у гандаль тавары з адтэрміноўкай плацяжу на 60 каляндарных дзён. Аб гэтым на пасяджэнні Мінгарвыканкама паведаміў першы намеснік міністра гандлю Беларусі Міхаіл Свянціцкі.

■ **У ходзе рэалізацыі аператыўнай інфармацыі ў вёсцы Барысава Кобрынскага раёна брэсцкія памежнікі і супрацоўнікі міліцыі затрымалі мікрааўтобус «Форд-Транзіт». У аўтамашыне былі выяўлены 60 спадарожнікавых антэн без дакументаў, якія б пацвердзілі легальнасць іх набыцця. Тавар на суму каля Br13 млн перададзены ў Кобрынскі РАУС.**

■ Эдуард Малафееў атрымаў Ісумрудны ордэн УЕФА за футбольныя заслугі. Узнагароду вядомаму беларускаму спецыялісту ўручыў прэзідэнт УЕФА Мішэль Плаціні ў Капенгагене перад пачаткам 33-га кангрэса гэтай арганізацыі, паведамілі ў прэс-службе асацыяцыі «Беларуская федэрацыя футбола» (АБФФ). Акрамя нашага земляка, узнагароды УЕФА атрымалі яшчэ некалькі вядомых у футбольным свеце людзей.

Поўны абзац

■ **На беларуска-латвійскай мяжы полацкія памежнікі затрымалі жыхароў вёскі Плюсы. «Скумекаўшы на траіх», яны вырашылі «дабавіць» гарэлкай латвійскай вытворчасці і накіраваліся ў краму на сумежным баку. На кожнага з сабутыльнікаў накладзены штраф у памеры 30 базавых велічынь (Br1 млн 50 тыс.).**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

«Рускі» тэатр збірае «Паўлінак»

На адну «Хрустальную Паўлінку» больш стане ў Нацыянальным акадэмічным драматычным тэатры імя Горкага. Сёлета найвышэйшую ўзнагароду Беларускага саюза тэатральных дзеячаў атрымае народная артыстка Беларусі Бэла Масумян.

Бэла Амікаўна выхавана на традыцыях менавіта беларускай тэатральнай школы. І яе творчасць прайшла ў сценах аднаго тэатра. У апошнія гады актрыса запомнілася выкананнем ролі Валянціны ў спектаклі «Валянцінаў дзень».

«Як любая добрая справа, тэатральная трымаецца на энтузіястах і прафесіяналах», — адзначыў старшыня Саюза тэатральных крытыкаў Рычард Смольскі.

— Я лічу, што з усіх мастацтваў найбольш жывым з'яўляецца тэатр, — падкрэсліў Аляксей Дударaў, старшыня Саюза тэатральных дзеячаў. — Фразу: «талент павінен быць галодны» здаецца, выдумаў сыты чыноўнік.

— Фразу наконт галоднага творцы прыдумалі яшчэ ў старажытным Рыме, — сказаў Уладзімір Рылатка, першы намеснік міністра культуры. — Заробкі ў нашых артыстаў вышэйшыя, чым у прадстаўнікоў іншых прафесій бюджэтнай сферы, напрыклад, медработнікаў і настаўнікаў. Відавочна, што тэатрам сёння трэба працаваць над тым, каб быць эканамічна моцнымі. Трэба павышаць коштны на квіткі...

Сёлета цырымонія ўручэння «хрустальных» і іншых прызоў пройдзе на новай сцэне Драматычнага тэатра беларускай арміі.

Лариса ЦІМОШЫК.

МИХАНОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ МИНСКОГО РАЙОНА

ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов:

Лот 1 — земельный участок в д. Кайково, площадь земельного участка — 0,2292 га, кадастровый номер 623684202601000202, начальная цена — **30 808 330** рублей.

Непосредственно рядом с участком проходят сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения.

Лот 2 — земельный участок в д. Кайково, площадь земельного участка — 0,2320 га, кадастровый номер 623684202601000203, начальная цена — **31 184 700** рублей.

Непосредственно рядом с участком проходят сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения.

Аукцион состоится **7 апреля 2009 года** в 14.00 по адресу: пос. Михановичи, пер. Садовый, 8.

Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **3 апреля 2009 года** до 17.00 в каб. 7.

УНП 600303747

Контактные телефоны: 8 017 503 71 00, 8 017 503 83 34.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» ПО ПОРУЧЕНИЮ КОМИССИИ ПО РАБОТЕ С ИМУЩЕСТВОМ, ОБРАЩЕННЫМ В ДОХОД ГОСУДАРСТВА, ПРИ БОРИСОВСКОМ РАЙИСПОЛКОМЕ

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже обращенного в доход государства здания лаборатории сушильно-раскроечного цеха (общ. пл. 387,6 кв.м), расположенного: г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 36. Начальная цена 130 254 680 бел. руб. Задаток 7 000 000 бел. руб. перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Оплата за объекты осуществляется в течение 2 месяцев и 25-ти дней с даты подписания протокола о результатах аукциона. Объекты продаются без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **25.04.2009 г.** в 15.00 по адресу: г. Борисов, ул. Чапаева, 6, к. 215. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.04.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактные телефоны (8017) 2246134, (80177) 739327. Сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ АУКЦИОНЕ

по продаже четырех земельных участков гражданам для строительства и обслуживания жилых домов Организатор аукциона — Новомышский сельский исполнительный комитет Барановичского района, Брестской области

№ п/п	Месторасположение земельного участка, адрес, кадастровый номер участка	Характеристика инженерных коммуникаций	Площадь земельного участка, га	Назначение участка	Начальная цена объекта, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы по формированию и регистрации земельного участка и проведению аукциона, руб.
1	Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Новомышский с/с, д. Звездная, ул. Встречная, 10 кадастровый номер 120486002601000410	участок свободен от застройки	0,1651	для строительства и обслуживания жилого дома	567780	56780	575792
2	Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Новомышский с/с, д. Козлякевичи, 80А кадастровый номер 120486003101000097	участок свободен от застройки	0,1528	для строительства и обслуживания жилого дома	187670	18770	575792
3	Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Новомышский с/с, д. Звездная-2, ул. Вильчковского, 141 кадастровый номер 120486000001000081	участок свободен от застройки	0,1023	для строительства и обслуживания жилого дома	351810	35180	591032
4	Республика Беларусь, Брестская область, Барановичский район, Новомышский с/с, д. Звездная-2, ул. Строительная, 27 кадастровый номер 120486000001000082	участок свободен от застройки	0,0999	для строительства и обслуживания жилого дома	343550	34360	575792

1. Аукцион состоится **30 апреля 2009 года** в 15.00 в здании Новомышского сельисполкома по адресу: Республика Беларусь, Брестская обл., Барановичский район, д. Новая Мышь, ул. Парковая, 6.

2. Условия аукциона:

- наличие не менее 2-х участников.

3. Продажа земельного участка производится гражданам Республики Беларусь, постоянно проживающим на территории РБ или приравненным к постоянно проживающим, в соответствии с законодательством.

4. Шаг аукциона к начальной цене земельного участка — 15 %.

5. Для участия в аукционе необходимо в сроки, указанные в извещении, представить в комиссию по проведению аукциона заявление, к заявлению прилагают:

- заверенную банком копию платежного поручения (квитанцию) о внесении задатка;
- копию документа, удостоверяющего личность (паспорт) покупателя или его доверенного лица;
- доверенность, заверенную нотариально, если в аукционе участвует представитель физ. лица.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

6. Сумма задатка перечисляется до 27 апреля 2009 г. до 17.00 на р/с 3600211140009, в ф-л 802 ОАО АСБ «Беларусбанк», код платежа 4901, УНП 200047005.

Адрес банка: г. Барановичи. Б. Штоккерау, 8А.

Получатель: Новомышский сельский Совет депутатов, 225331, Брестская обл., Барановичский р-н, д. Новая Мышь, ул. Парковая, 6.

Победитель аукциона — участник, предложивший наибольшую цену.

Аукцион признается не состоявшимся, если заявлений на участие подано менее, чем 2-мя участниками.

Предмет аукциона не может быть продан по начальной цене.

7. Всем желающим предоставляется возможность предварительно ознакомиться с объектом продажи каждый четверг недели после опубликования настоящего извещения в СМИ по предварительной записи в комиссии по телефону (8 0163) 43 12 36.

8. Продажа земельных участков производится без изменения их целевого назначения.

9. Покупатель, желающий участвовать в торгах по нескольким лотам, вносит задаток в размере 10 % от начальной стоимости земельного участка с наибольшей стоимостью.

10. Заявления на участие в аукционе принимаются после размещения извещения о проведении аукциона в СМИ в рабочие дни с 01 апреля 2009 г. в комиссии с 8.00 до 13.00 в Новомышском сельисполкоме. Последний день приема документов 27 апреля 2009 г. до 15.00. Заключительная регистрация участников аукциона 30 апреля 2009 г. с 14.00 до 15.00.

К участию в торгах не допускаются участники, не прошедшие заключительную регистрацию.

11. Победитель аукциона обязан: подписать протокол аукциона в день проведения аукциона; не позднее 10 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка возместить расходы по формированию и регистрации зем. участка и затраты на подготовку и проведение аукциона (в том числе затраты, связанные с размещением извещения о проведении аукциона в средствах массовой информации); внести плату за земельный участок, не позднее 12 дней после вступления в силу решения о предоставлении земельного участка произвести регистрацию права частной собственности на земельный участок.

ФОНД «МИНСКОБЛГОСИМУЩЕСТВО»

ВНОСИТ ИЗМЕНЕНИЯ В ИЗВЕЩЕНИЕ ПО ПРОВЕДЕНИЮ АУКЦИОНА, опубликованное в газете «Звязда» от 24 марта 2009 г. № 54, в части изменения начальной цены права заключения договора аренды земельных участков, необходимых для обслуживания продаваемых объектов, находящихся в собственности Любанского района, и установления суммы задатков для участия в аукционе по продаже названных объектов:

№ лота	Право аренды земельного участка, руб.	Сумма задатка для участия в аукционе, руб.
3	47 800	8 000
4	65 500	10 000
5	134 960	15 000
6	26 600	6 000

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» ПО ПОРУЧЕНИЮ БОРОВЛЯНСКОГО СЕЛЬИСПОЛКОМА

ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

на право заключения договора аренды земельного участка для строительства одноквартирного жилого дома в д. Слободщина Минского района, сроком на 99 лет, площадь участка 0,1362 га, кадастровый номер 623680608101000070, начальная цена – 9 211 887 рублей, в неопосредственной близости имеются сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжения. Задаток в сумме – 900 000 рублей перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Оплата предмета аукциона должна быть произведена в течение 10 рабочих дней со дня принятия решения о предоставлении земельного участка. Договор аренды заключается в течение 2-х рабочих дней после оплаты стоимости предмета аукциона. Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельным участком. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **30.04.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.04.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324.

Контактный телефон (8 017) 224 61 36. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

Открытое акционерное общество

«СТРОЙТРЕСТ № 35»

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС за 2008 г.

АКТИВ	На конец отчетного года млн руб.	ПАССИВ	На конец отчетного года млн руб.
I. Внеоборотные активы		**III. Капитал и резервы**	
Основные средства:		Уставный фонд	54
первоначальная стоимость	22 504	Резервный фонд	292
амортизация	9 694	Добавочный фонд	13 218
остаточная стоимость	12 810	Нераспределенная прибыль	937
Нематериальные активы остаточная стоимость	2	Целевое финансирование	2
Вложения во внеоборотные активы	18	Итого по разделу III	14 503
Итого по разделу I	12 830	**IV. Долгосрочные кредиты и займы**	**1 000**
II. Оборотные активы		**V. Краткосрочные обязательства**	
Запасы и затраты	6 448	Краткосрочные кредиты и займы	770
Налоги по приобретенным ценностям	65	Кредиторская задолженность	16 167
Дебиторская задолженность	12 085	Задолженность перед участниками (учредителями)	114
Денежные средства	1 126	Прочие краткосрочные обязательства	3 904
Прочие оборотные активы	3 904	Итого по разделу V	20 955
Итого по разделу II	23 628		
БАЛАНС	36 458	БАЛАНС	35 458

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ

Наименование показателей	Код строки	За отчетный период млн руб.
1	2	3
I. Доходы и расходы по видам деятельности		
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг	010	66 115
Налоги и сборы, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг	011	5 488
Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку)	020	60 627
Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг	030	56 879
Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг (020-030-040-050)	060	3 748
Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов	120	172
Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов	160	-935
Прибыль (убыток) (060+/-120+/-160)	200	2 985
Налоги, сборы и платежи из прибыли	210	1 017
Прочие расходы и платежи из прибыли	220	12
Чистая прибыль (убыток) (200-210-220)	240	1 956
Справочно (из строки 240): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль		476
Начислено на выплату дивидендов за 2008 год		114
Количество акционеров		357

АУДИТОРСКОЕ ЗАКЛЮЧЕНИЕ

По мнению аудиторской организации ЧАУП «Аудит-финанс», бухгалтерская (финансовая) отчетность ОАО «Стройтрест № 35», сформированная в соответствии с требованиями законодательства Республики Беларусь по бухгалтерскому учету и отчетности, достоверно отражает во всех существенных отношениях финансовое положение «ОАО «Стройтрест № 35» на 1 января 2009 года и результаты финансовой деятельности за 2008 год.

УНП 100289278

ОБЪЯВЛЕНИЕ ОБ ОТКАЗЕ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА

Фонд «Брестоблимущество» сообщает об отказе от проведения назначенного на 7 апреля 2009 года аукциона по продаже капитального строения (вспомогательного здания столовой) и права заключения договора аренды земельного участка, расположенного по адресу: Брестская обл., Ивацевичский р-н, 2,2 км юго-западнее д. Холопья (извещение опубликовано в газете «Звязда» от 04.03.2009 № 40).

Контактные тел. в г. Бресте: 20 87 85, 23 44 06, 23 12 63.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» ПО ПОРУЧЕНИЮ ЗАСЛАВСКОГО ГОРИСПОЛКОМА

проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в г. Заславле:

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Пл. зем. участка (га)	Наличие инженерных сетей	Начальная цена (бел. рублей)	Расходы по документации (бел. рублей)
1	ул. Приозерная, 623650100001003904	0,1311	в непосредственной близости сети электроснабжения, водоснабжения, газоснабжение возможно при условии проектирования	5 050 000	507 844
2	ул. Анусинская, 79, 623650100001003906	0,1020		12 490 000	533 794
3	пер. Хмелевский, 4, 623650100001003908	0,0982		3 780 000	502 665
4	ул. Комсомольская, 623650100001003907	0,1486		11 490 000	549 331
5	ул. Спортивная, 5, 623650100001003905	0,1080		5 150 000	513 023
6	ул. Спортивная, 6, 623650100001003903	0,1098		5 240 000	513 023
7	ул. Приозерная, 623650100001003909	0,1381		5 320 000	507 844

Задаток в размере 10 % от начальной цены перечисляется на р/с 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», г. Минск, МФО 153001357, УНП 690324015, КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **30.04.2009 г.** в 15.30 по адресу: г. Заславль, ул. Великая, 1, актовый зал Заславского горисполкома. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.04.2009 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 324.

Контактный телефон (8 017) 224 61 36. Наш сайт в интернете: www.rlt.by.

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» ПО ПОРУЧЕНИЮ РУДЕНСКОГО ПОСЕЛКОВОГО ИСПОЛКОМА ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Пуховичском р-не:

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Пл. зем. участка (га)	Нач. цена (бел. руб.)	Задаток (бел. руб.)	Расходы по документации (бел. руб.)
1	д. Варшавка* 624475701601000074	0,1337	1 500 000	150 000	476 000
2	д. Варшавка* 624475701601000071	0,1309	1 500 000	150 000	429 000

** - в непосредственной близости имеются линии сети электроснабжения*

Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **30.04.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **23.04.2009 г.** до 17.00 по указанному адресу.

Контактный телефон (8 017) 224 61 36. Наш сайт в интернете: www.rlt.by

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015

КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ» ПО ПОРУЧЕНИЮ УЗДЕНСКОГО РАЙИСПОЛКОМА ПРОВОДИТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже земельных участков в частную собственность граждан Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов в Узденском р-не:

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Пл. зем. участка (га)	Наличие возможности подключения к сетям	Нач. цена (бел. руб.)	Задаток (бел. руб.)	Расходы по документации (бел. руб.)
1	д. Бервичи, ул. Колхозная, 4 625684200601000135	0,2553	электроснабжение, водоснабжение, газоснабжение	1 500 000	150 000	654 363
2	аг. Зеньковичи, ул. Центральная, 55 625684204101000252	0,2500	электроснабжение, газоснабжение	1 000 000	100 000	660 988

Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации. Все желающие могут ознакомиться с документацией и земельными участками. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **30.04.2009 г.** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326. Заявления на участие и

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 12 ад 19 лютага 2009 г.

27

САКАВІКА
2009 г.
ПЯТНІЦА
№ 12 (15566)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

ШТО ХВАЛЮЕ БЕЛАРУСКАЕ СТУДЭНЦТВА?

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Як падтрымаць студэнтаў ва ўмовах крызісу? Павялічыць памер стыпендый, «замарозіць» плату на ўвесь перыяд навучання, пераводзіць на бюджэтныя месцы студэнтаў-платнікаў, якія вучацца на «добра» і «выдатна», павялічыць бюджэтны прыём... Меры па сацыяльнай падтрымцы студэнцтва абмяркоўваліся ў Мінску на семінары актывістаў прафсаюзных арганізацый студэнтаў ВНУ, на сустрэчу з якімі прыйшлі прадстаўнікі галоўнага адукацыйнага ведамства краіны.

Як зазначыла ў сваім выступленні **намеснік міністра адукацыі Таццяна КАВАЛЁВА**, усё, што адбываецца ў краіне, малады чалавек ацэньвае праз прызму вырашэння сваіх праблем. Наколькі якасна арганізаваны вучэбны працэс? Ці забяспечаны ён месцам у студэнцкім інтэрнаце? Як арганізаваны яго адпачынак? Ці ёсць у яго магчымасць для аздараўлення? Менавіта па гэтых фактах у маладых людзей складваецца меркаванне аб рэальнасці выканання дзяржаўных праграм. Пацвярджае гэта і сацыялагічнае даследаванне, праведзенае Мінскім навукова-даследчым інстытутам сацыяльна-эканамічных і палітычных праблем Мінгарвыканкама, падчас якога было вызначана, што найбольш папулярным у асяроддзі сталічнай студэнцкай моладзі з'яўляецца лозунг аб сацыяльнай абароне. Яго падтрымалі больш за тры чвэрці апытаных студэнтаў мінскіх ВНУ, прычым за апошнія гады гэта лічба павялічылася.

— І ўсё ж такі нягледзячы на тую акалічнасць, што Рэспубліка Беларусь была, ёсць і будзе сацыяльна арыентаваній дзяржавай, мы павінны фарміраваць у маладых людзей адказнасць за іх уласнае жыццё, за іх поспех і дабрабыт, і, у рэшце рэшт, за дабрабыт усёй краіны, — падкрэсліла Таццяна Кавалёва. — Сёння даволі шырока распаўсюджана меркаванне, што сучасны студэнт — гэта малады чалавек, які пад'язджае да ВНУ на ўласным аўтамабілі, і менавіта таму ў выкладчыкаў узнікаюць праблемы з паркоўкай. Не буду адмаўляць, што такі тып студэнта і сапраўды існуе, але ў студэнцкім асяроддзі павялічваецца колькасць маладых людзей з сем'яў з вельмі сціплымі даходамі, для якіх наша падтрымка мае вельмі важнае значэнне. Сёння ў краіне налічваецца больш за 420 690 студэнтаў, з іх 59 працэнтаў атрымліваюць вышэйшую адукацыю за ўласныя грошы. Меркаванне, што ўсе яны з заможных сем'яў, абсалютна памылковае. Для многіх аплаціць вучобу дзяцей — сапраўдная праблема. А дзіця, якое навучаецца ў іншым горадзе і жыве асобна ад сям'і, яшчэ трэба і матэрыяльна падтрымліваць.

Адной з самых злабадзённых праблем для сучаснага беларускага студэнта застаецца пошук даху над галавой, тым больш што за апошнія гады колькасць маладых людзей, якія атрымліваюць вышэйшую адукацыю, істотна павялічылася за кошт студэнтаў-платнікаў. Павялічылася сярод студэнцтва таксама і колькасць вясковай моладзі. Увогуле па краіне забяспечанасць месцамі ў студэнцкіх інтэрнатах складае 62,7 працэнта ад патрэбы. Яшчэ больш складаная сітуацыя назіраецца ў Мінску, куды з'язджаецца моладзь з усёй краіны. Тут забяспечаны месцамі ў інтэрнатах толькі 52 працэнты ад тых, хто мае ў гэтым патрэбу. 4 інтэрнаты ў сталіцы пастаўлены на капітальны рамонт, між іншым, гэта 2705 месцаў. А арэнда жылля ў Мінску «кусаецца»... Студэнцкая вёска пакуль таксама толькі вельмі прыгожы праект, да ўвасаблення якога пройдзе нямала часу, прычым у гэтага праекта з'явіліся апаненты, якія папярэджваюць аб пагрозе стварыць у горадзе своеасаблівы цэнтр крымінальнага асяроддзя.

— Нам ні ў якім разе нельга захапляцца толькі чыста знешнім, тэхнічным бокам праекта, — папярэдзіла Таццяна Кавалёва. — Абавязкова трэба зрабіць так, каб студэнцкая вёска стала месцам моладзевай культуры ў самым высокім сэнсе гэтага слова.

У галоўным адукацыйным ведамстве не хаваюць, што са 105 студэнцкіх інтэрнатаў, якія знаходзяцца на балансе ВНУ Мінадукацыі, капітальны рамонт патрабуецца 70. І калі сёння іх планава не зачыняць на капрамонт, то праз некалькі гадоў сітуацыя пагоршыцца.

— Зараз плата за інтэрнат складае ўсяго 45 працэнтаў ад базавай велічыні, але ці не ў кожным пакоі ёсць і тэлевізар, і камп'ютар, і халадзільнік, і музычны цэнтр, і шмат іншых электрабытавых прыбораў. Дык можа ёсць сэнс акрэсліць пэўны мінімум, які будзе ўключаны ў вызначаную плату за інтэрнат, а ўсё, што звыш, студэнты будуць аплачваць самастойна? — падзялілася сваімі меркаваннямі Таццяна Кавалёва. — Магчыма, хоць такім чынам мы прымусім іх эканомна ставіцца да энергарэсурсаў? Калі я, вяртаючыся з камандзіроўкі, бачу ў начным горадзе толькі два будынкі, якія свецяцца ў цемры, і гэтыя будынкі — студэнцкія інтэрнаты, у мяне ўзнікае заканамернае пытанне. Што гэта: няўменне і нежаданне арганізаваць свой уласны рабочы дзень ці неразуменне, што за ўсім гэтым стаіць? Я лічу, што трэба рабіць правілы пражывання ў інтэрнатах больш жорсткімі, і калі студэнты не захоўваюць культуру пражывання, ігнаруюць беражлівасць, то трэба іх бязлітасна высяляць. Вымыць сценкі на кухні, павесіць фіранку, прыбраць смецце... Няўжо гэта так складана? Між іншым, менавіта з такіх «дробязяў» распачынаецца культура дома, пад'езда і ўсёй краіны.

Закранула Таццяна Кавалёва і яшчэ адну балючую тэму, пра якую ішла гаворка на апошняй сустрэчы міністра Аляксандра Радзькова са студэнцкім актывам — адмена льготаў для студэнтаў на праезд у пасажырскім транспарце. Своеасаблівай кампенсацыяй гэтай вельмі важнай сацыяльнай падтрымкі павінна была стаць матэрыяльная дапамога на праезд тым, хто сапраўды мае ў гэтым патрэбу. Хто можа на яе прэтэндаваць і ў якім парадку выдзяляецца матэрыяльная дапамога на праезд, высвятляла пастанова Савета Міністраў, прынятая ў сакавіку мінулага года. Аднак гэты дакумент утрымлівае столькі абмежаванняў, што ў рэальнасці па кампенсацыі ў камісіі па аказанні матэрыяльнай дапамогі на праезд звяртаюцца толькі адзінкі...

Так, згодна з пастановай урада, частковая кампенсацыя кошту праезду прадугледжана толькі за паездкі на прыгарадным і міжгародніх транспарце, а гарадскі пасажырскі транспарт у гэтым дакуменце ўвогуле не згадваецца. Да таго ж матэрыяльная дапамога можа аказвацца толькі пры ўмове, калі сярэднедушавы даход сям'і студэнта не перавышае 100 працэнтаў найбольшай велічыні бюджэту працаздольнага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва. З 1 лютага гэта сума складае 234 тысячы 370 рублёў. Сярэднедушавы даход сям'і вызначаецца за тры месяцы, што папярэднічалі звароту за прызначэннем матэрыяльнай дапамогі на праезд. Ёсць адзін цікавы нюанс: у даход сям'і ўключаецца ў тым ліку і стыпендыя студэнта. Два студэнты ў сям'і — плюс дзве стыпендыі ў сямейны бюджэт. Дапамога на праезд можа быць аказана ў выглядзе частковай кампенсацыі (не больш за палову) кошту праязнога дакумента да месца пражывання сям'і. На аўтобусах рэгулярных міжгародніх зносінаў можна здзейсніць толькі дзве паездкі ў месяц (туды і назад), а на прыгарадным транспарце — чатыры паездкі ў месяц. Прычым часткова кампенсаваць можна толькі паездкі ў суботу, нядзелю, святочныя дні і ў дні зімовых канікул. А, напрыклад, паехаць да бацькоў у пятніцу, а вярнуцца ў панядзелак, каб быў час не толькі адпачыць, але і дапамагчы бацькам, студэнт не можа. Цікава, чаму? Тым больш, што ў многіх студэнтаў сталічных ВНУ заняткі пачынаюцца ў другую змену...

Можна ўзяць умоўную сям'ю: маці-настаўніца ці выхавальніца ў дзіцячым садку, якая пражывае ў Гродзенскай ці Гомельскай вобласці, і двое дзяцей-студэнтаў, якія навучаюцца ў сталічных ВНУ. Колькі раз за вясну ім трэба прыехаць дамоў, каб дапамагчы матулі з пасяўной на ўласных сотках?! А калі білет у адзін бок каштуе 25-30 тысяч рублёў? Да таго ж, каб атрымаць матэрыяльную дапамогу на праезд, трэба падаць цэлы стос даведак... Але студэнты не звяртаюцца па кампенсацыю зусім не таму, што ім лянота вазіцца з паперкамі, а таму, што яны або не трапляюць у катэгорыю тых, хто паводле матэрыяльнага становішча сям'і можа прэтэндаваць на атрыманне матэрыяльнай дапамогі, або таму, што паездкі дамоў сталі для іх вельмі рэдкімі, ці яны элементарна «не ўпісваюцца» ў адведзеныя рамкі «субота-нядзеля». А калі ўзяць сталічных студэнтаў, то трэба дадаць, што для таго, каб ў Мінску дабрацца да месца вучобы, практыкі ці заняткаў фізкультурай, нярэдка трэба скарыстацца трыма відамі транспарту. Кошт кожнага білецікa — 600 рублёў. Многія аддаюць перавагу наземнаму транспарту, дзе, калі пашанцуе, можна праехаць і «зайцам», што нельга зрабіць у метро. Дастаткова зазірнуць у соты аўтобусны маршрут, уздоўж якога размяшчаецца вялікая колькасць вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. У адказ на просьбу паказаць праязны білет кандуктар можна пачуць усе што заўгодна. Відавочна, што створаная сістэма кампенсацый за праезд сёння проста не працуе і яе трэба змяняць. Ці хоць бы падняць планку даходаў сем'яў, каб павялічыць колькасць студэнтаў, якія змогуць атрымліваць дзяржаўную падтрымку...

Старшыня прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў БДУ Ніна РАДЗЭВІЧ узняла праблему сацыяльнай неабароненасці студэнтаў, якія навучаюцца на платнай аснове і ў перыяд навучання страчваюць сваіх бацькоў. У мінулым годзе ў БДУ было пяць такіх выпадкаў. На жаль, для пераводу іх на бюджэт законных падстаў няма, паколькі для гэтага яны павінны навучацца пераважна на дзевяць і дзесяць балаў. Заканадаўствам не прадугледжана і магчымасць пераводу такіх студэнтаў на дзяржзабеспячэнне. Парады перавесціся ім на завочнае аддзяленне, каб працаваць і аплачваць сваё навучанне, выглядаюць сама меней несур'ёзна, таму што наўрад ці знойдзецца працадавец, які дасць згоду ўзяць чалавека без вопыту работы толькі з агульнай сярэдняй адукацыяй за плячыма. А калі ў студэнта засталіся яшчэ малодшыя брат ці сястра, якіх таксама трэба паставіць на ногі? Плюс яму трэба шукаць грошы, каб аплачваць і сваё навучанне... Напэўна гэта той самы выпадак, калі ад разважанняў пра сацыяльныя гарантыі трэба пераходзіць да рэальных крокаў.

— Для рэктараў ВНУ трэба стварыць прававое поле, каб яны мелі права на законных падставах перавесці студэнта, які страціў бацькоў, на навучанне за кошт бюджэту, — звярнулася да Таццяны Кавалёвай Ніна Радзевіч. — У Палажэнні аб парадку пераводу студэнтаў і навучэнцаў з платнага навучання на навучанне за кошт сродкаў рэспубліканскага і (ці) мясцовага бюджэтаў неабходна прадугледзець у тым ліку і сацыяльныя падставы для такога пераводу. Таксама студэнтаў нават на ўсю краіну зусім няшмат. Але ніхто не ведае, які лёс іх чакае за сценамі навучальнай установы. А няшчасце можа здарыцца з кожным...

(Заканчэнне ў наступным нумары «ЧЗ».)

Надзея НІКАЛАЕВА.

ЯК ЖЫЦЬ І ДЗЕ — вось у чым пытанне!

Ва ўсе часы важнай праблемай для чалавека было жыллё. Гэта адзін з тых атрыбутаў, без якога немагчыма існаваць фізічна. А калі няма дабрабыту, тады аб духоўных запытах цяжэй клапаціцца. Вось і змагаюцца людзі, хто як можа, з жыццёвым неўладкаваннем. Здаецца, што ў наш надзвычай імклівы і дынамічны час асабліва хочацца мець тое светлае, цёплае і ўтульнае месца, куды можна прыйсці і проста адпачыць, не думаючы ні аб чым.

Многім, напэўна, вядома пачуццё радасці, калі ўдаецца ўладкавацца ў інтэрнат, студэнцкі альбо іншы. Тады здаецца, што дастаткова наладзіць добрыя адносіны з суседзямі па пакоі і... жыццё будзе шчаслівым. Аднак потым гэтага робіцца мала. Мне цікава было даведацца, як вырашаюць свае жыллёвыя праблемы маладыя прыезджыя людзі ў сталіцы. Якую частку свайго бюджэту яны выдаткоўваюць на аплату кватэр? Я імкнулася распытаць не толькі студэнтаў...

Вольга ТРУКШАНІНА, студэнтка БДПУ імя Максіма Танка (факультэт беларускай філалогіі і культуры) жыве на кватэры ўжо каля 2 гадоў і не шкадуе. Ёй падабаецца, што ў яе ёсць асабістыя кухня, ванны пакой і, самае галоўнае, што можна ў любы час прыйсці дадому.

— Нават пасярод ночы, — удакладняе Вольга. — Прапускны рэжым у інтэрнатах не дазваляе студэнтам жыць поўным жыццём. Самы час пагуляць — а ты павінен бегчы, каб паспець у інтэрнат.

Плата за інтэрнат зараз складае 15000 рублёў. Нязначная, калі параўноўваць з арэндай кватэр. Ёсць і іншыя «плюсы».

— Інтэрнат, як правіла, размяшчаецца бліска ад навучальнай установы, — пералічвае іх Вольга. — Там шмат людзей, заўсёды весела. Патрэбны канспект можна знайсці ў любы час. Спартыўная зала, секцыі... Але кватэра падкупляе адчуваннем уласнай індывідуальнасці і незалежнасці. Залежыш толькі ад грошай, якія часам знайсці цяжка. Стыпендыя, на жаль, не дазваляе студэнту сябе ўтрымліваць.

— А як наконт адпачынку, які таксама патрабуе грошай?

— На асабістыя патрэбы я трачу ў месяц прыкладна 250 тысяч, з якіх мала што адводзіцца на адпачынак.

Так, здымаць кватэру — не танное задавальненне. Напрыклад, арэнда пакоя (а гэта значыць, што ты жывеш з гаспадыняй), каштуе каля 150 долараў на дваіх. На аднаго прыпадае 75. Гэта без уліку аплаты камунальных паслуг. А за арэнду 2-пакаёвай кватэры даводзіцца аддаваць каля 350 долараў. Плюс асобная даплата за электрычнасць і тэлефон.

Асноўным крытэрыем выбару кватэры з'яўляецца кошт, потым — месцазнаходжанне адносна лініі метро і, вядома ж, абстаноўка. Немалаважным з'яўляецца састаўленне дагавора і адсутнасць папярэдняй аплаты.

Арцём АРСЁНАЎ, спецыяліст па продажах ТАА «РасБелСэрвіс — 2005», здымае кватэру амаль паўтара года. Падчас вучобы ён жыў у інтэрнаце. Змена месца жыхарства ўнесла карэктывы ў яго бюджэт.

— Калі я быў студэнтам, — кажа Арцём, — то мог спакойна патрацiць на адпачынак тысяч 500 у месяц. Зараз жа я выдзяляю на культурныя мерапрыемствы не больш за 60 долараў.

— У інтэрнаце жыць было лягчэй?

— У пэўным сэнсе так. Заплаціў 80 тысяч за паўгода — і жыві спакойна. Але на кватэры больш камфортна. Самая галоўная перавага — асобны санвузел. Да таго ж, сам сабе гаспадар. Адчуваеш сябе больш самастойным. За гэта не шкада заплаціць грошы. Хоць часам бывае і цяжка. Даводзіцца сябе абмяжоўваць.

— Колькі грошай ты траціў на сябе, калі жыў у інтэрнаце, і колькі траціш зараз, без уліку аплаты жылля і культурнай праграмы?

— У часы студэнцтва я траціў каля мільёна.

— Ого! Не мала.

— Але ж і працаваў я таксама шмат. І, што самае дзіўнае, паспяваў усюды. Падчас вучобы ва ўніверсітэце я спраўляўся на трох работах. А зараз я трачу на сябе каля 600 тысяч. Інтарэсы засталіся тыя ж. Толькі магчымасці змяніліся.

— Як лічыш, ад чаго залежыць удалая адаптацыя да жыцця ў інтэрнаце?

— Ад здольнасці чалавека ўжывацца з іншымі. Ёсць такая рэч, як неспалучэнне характараў. Нехта не надта акуратны, а нехта не пераносіць беспарадак і нямыты посуд. Хтосьці схільны да адзіноты. Але ёсць і такія, каму зносіны з людзьмі патрэбны як паветра.

Аляксандр РАБЫ, студэнт БНТУ (аўтатрактарны факультэт), жыве ў інтэрнаце тры гады і кажа, што была б магчымасць — адразу б з'ехаў на кватэру. Але пакуль даводзіцца цярпець.

— Не люблю інтэрнат. Я з людзьмі сыходжуся вельмі цяжка. Разумею, што гэта — танна. Але складана бывае знайсці агульную мову з суседзямі па пакоі. За магчымасць пабыць сам-насам не шкада ніякіх грошай.

Мне блізкая Сашына думка. Сама студэнтка ўжо 4 гады, жыву ў інтэрнаце. Мне таксама надакучыла залежаць ад агульнага настрою, падладжвацца пад абставіны і, што самае галоўнае, прызвычайвацца да жыллёвых умоў, якія пакідаюць жадаць лепшага. Хочацца часам адасобленасці. Ці магчымасці пабыць з блізкім чалавекам удваіх. Часам цяжка стрымацца, каб не пасварыцца з суседкай па пакоі, якая не паспела прыбраць свае рэчы. Хочацца і асабістага санвузла, кухні, ваннага пакоя... Эканамічная сітуацыя такую раскошу, як асобная кватэра, робіць пакуль недасягальнай. Асабліва калі ты не працуеш і залежыш ад бацькоў.

З іншага боку, напэўна, ужо склалася звычка — знаходзіцца заўсёды сярод людзей, там, дзе можна разам падрыхтавацца да сесіі, прыгатаваць ежу і проста паразмаўляць усёй вялікай сям'ёй, якой становяцца дзяўчаты ў пакоі і сябры па паверсе...

Жыць насамрэч можна ўсюды. А вось як і дзе — кожны вызначае сам.

Жыллёвыя плошчы даследавала студэнтка БДПУ імя Максіма Танка Наталля БЕЛЬЧАНКА.

Продаж алкаголю з 21 года, а піва — далей ад школы

Гэтыя і іншыя прапановы па барацьбе са злачыннасцю ў моладзевым асяроддзі прагучалі ў ходзе прэс-экспертынгу на тэму «Мужчыны ў вырашэнні злабадзённай праблемы хатняга гвалту». Ён прайшоў у Мінску пад эгідай прадстаўніцтва ААН у Беларусі. На сустрэчу з журналістамі запрасілі аўтарытэтных экспертаў па гэтай праблеме. Адсюль і назва мерапрыемства: прэс-экспертынг.

АГІДНАЯ І, НА ЖАЛЬ, ЖЫВУЧАЯ З'ЯВА

З-за хатняга гвалту, па словах **кіраўніка дэпартамента грамадскай інфармацыі прадстаўніцтва ААН у Беларусі Віктара РАДЗІВІНОЎСКАГА**, многія тысячы маладых людзей не могуць быць шчаслівымі і адчуваць сябе ў бяспецы. Па звестках экспертаў, кожная трэцяя жанчына незалежна ад узросту на працягу свайго жыцця зведвае гвалт: фізічны, эканамічны, псіхалагічны, сэксуальны. Таму летась ААН пачала рашучую глабальную кампанію па барацьбе з гэтым злом, якая працягнецца да 2015 года. І гэта сустрэча прахадзіць у рэчышчы ААНаўскай кампаніі. Адна з яе мэт — фарміраванне негатыўнага грамадскага стаўлення да розных праяў гвалту, актыўнае ўключэнне ў барацьбу з ім падлеткаў і маладых мужчын. Бо без іх зацікаўленага ўдзелу нельга разлічваць на поспех.

ГВАЛТ — РЭАЛЬНАСЦЬ НАШЫХ ДЗЁН

Яўген ПАЛУДЗЕНЬ, палкоўнік міліцыі, начальнік галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку, грамадскай бяспекі і прафілактыкі Міністэрства ўнутраных спраў, паведаміў, што летась у нашай краіне ад злачынных дзеянняў пацярпелі больш за 120 тысяч чалавек. Амаль палова з іх — дзяўчаты і жанчыны. Таму сёння вельмі важна весці мэтанакіраваную барацьбу з дрэннымі звычкамі ў моладзевым асяроддзі, якія з часам прыводзяць да злачынстваў. Напрыклад, з модным зараз ужываннем алкаголю, бязмэтавым блуканнем кампаній моладзі па вуліцах і плошчах з бутэлькамі і бляшанкамі піва ў руках. З гэтай нагоды два міністэрствы — аховы здароўя і ўнутраных спраў — прапануюць прадаваць алкагольныя напоі з 21-гадовага ўзросту, таксама забараніць піццё піва на вуліцах, на лаўках у скверах і парках. Для гэтага ёсць спецыяльныя месцы: піўныя бары, кавярні і рэстараны. Калі ласка, там і ўжывайце гэты напой. На думку Яўгена Палудзеня, варта таксама забараніць продаж піва ў шапіках, якія знаходзяцца побач са школамі. Піва на іх паліцах нярэдка правакуе падлеткаў на яго набыццё, а нядобрасумленныя прадаўцы ў пагоні за прыбыткам часта прадаюць піва школьнікам.

Таму, на погляд Яўгена Палудзеня, трэба вітаць і падтрымліваць любую карысную справу, якая садзейнічае правільнаму выхаванню моладзі. Добра зарэкамендавалі сябе штогадовыя спартыўна-аздараўленчыя лагеры для цяжкіх падлеткаў з нявыдалых сем'яў, якія арганізоўваюцца з мэтай адцягнуць дзяцей з-пад уплыву вуліцы. Можа таму летась зарэгістравана на 20 тысяч менш злачынстваў, чым у 2007 годзе. Гэта таксама вынік вялікай работы па прававым выхаванні падлеткаў і іх бацькоў, у тым ліку і жанчын.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Абітурыент—2009

БДУ запрашае гасцей

Вясенніе дні адчыненых дзвярэй — апошняя магчымасць вызначыцца абітурыентам з месцам будучай вучобы.

У Белдзяржуніверсітэце **28 сакавіка** абітурыентаў запрашаюць у госці на геаграфічны (пачатак у 10 гадзін), гістарычны (у 12 гадзін), фізічны (у 12 гадзін), хімічны (у 14 гадзін), эканамічны (у 14 гадзін), ваенны (у 10 гадзін) факультэты і на факультэт радыёфізікі і электронікі (у 10 гадзін).

31 сакавіка гасцей чакаюць на філалагічным факультэце (у 12 гадзін), у Дзяржаўным інстытуце кіравання і сацыяльных тэхналогій (у 12 гадзін), у Юрыдычным каледжы (у 10 гадзін) і ў Ліцэі БДУ (у 11 гадзін). **1 красавіка** — на факультэце журналістыкі (у 14 гадзін), юрыдычным факультэце (у 10 гадзін) і Інстытуце тэалогіі імя святых Мяфодзі і Кірыла (у 15 гадзін).

2 красавіка эстафету прымуць факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі (пачатак у 14 гадзін), Інстытут неперарыўнай адукацыі (у 14 гадзін), Інстытут бізнэсу і менеджменту тэхналогій (у 11 гадзін). Біялагічны факультэт і факультэт філасофіі і сацыяльных навук праводзяць дзень адчыненых дзвярэй **3 красавіка** у 14 гадзін.

А фінішуюць вясенніе дні адчыненых дзвярэй у Белдзяржуніверсітэце **4 красавіка**. У гэты дзень з абітурыентамі сустрэнуцца выкладчыкі матэматычнага факультэта (у 14 гадзін).

Надзея НІКАЛАЕВА.

АД 14 І СТАРЭЙ

У новым законапраекце прапануецца вызначыць узрост, з якога дзіця становіцца маладым грамадзянінам

Прадметам абмеркавання на пасяджэнні камісіі Палаты прадстаўнікоў па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі стаў праект закона аб асновах дзяржаўнай моладзевай палітыкі. З той пары, як быў прыняты дзейны сёння закон «Аб агульных пачатках дзяржаўнай моладзевай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь», прайшло ўжо 17 гадоў. Натуральна, наспела патрэба ў карэкціроўцы. Сярод «прагалаў», якія варта запаўняць — нявызначанасць ніжняй мяжы ўзросту моладзі. У новым законапраекце прапануецца прылічаць да катэгорыі маладых грамадзян з 14 гадоў. Гэта, дарэчы, адзін з тых момантаў, што выклікаў найбольшую колькасць спрэчак — як альтэрнатыўны варыянт агучваўся таксама і 16-гадовы ўзрост.

Сярод новых артыкулаў у праекце закона прапанаваныя сацыяльная падтрымка моладзі, арганізацыя сацыяльных цэнтраў, што будзе прадугледжваць падтрымку працоўнай, студэнцкай моладзі, паведаміла журналістам дэпутат камісіі Алена Шамаль. Меркавалася, што ў праекце будзе прапісана павелічэнне ўзроставага цэнзу на набыццё спіртных напояў, аднак гэта аддадзена на водкуп іншым законным актам (якія рэгулююць праваадносіны ў сферы рэалізацыі алкагольнай прадукцыі).

Дыскусіі вядуцца вакол 21-гадовага ўзросту як мінімальнага для пакупнікоў алкаголю. «Алкагольнае» пытанне актыўна дыскутуецца і не толькі з пункту гледжання ўзросту для яго набыцця. Напрыклад, старшыня камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, справах сям'і і моладзі Алег Вялічка ўпэўнены, што трэба перш-наперш прызнаць піва алкагольным напоем і забараніць яго продаж нароўні з іншымі, бо «ўсё пачынаецца з піва». А разам з тым навесці парадак у гандлі — узяць пад жорсткі кантроль тыя ж кіёскі, дзе часцяком і не зважаюць на ўзрост пакупніка... Свой погляд на праблему выказала Ірэна Дыль, начальнік упраўлення па справах моладзі Міністэрства адукацыі: «Я больш схіляюся да таго, што не забаронныя меры павінны быць вызначальнымі». І ў гэтым, безумоўна, ёсць рацыя.

Падчас пасяджэння таксама абмяркоўвалася магчымасць фарміравання асобнага дзяржаўнага камітэта па справах моладзі.

Зоя ВАРАНЦОВА.

Горацкія дзеці малююць лясы Амазоніі

Вучні Горацкай дзіцячай школы мастацкіх рамёстваў атрымалі 4 дыпломы з Бразіліі. Дзеці бралі ўдзел у міжнародным праекце «Мастацтва ў абарону лясных рэсурсаў».

Увогуле, размова ішла пра абарону лясоў Амазоніі. І маладыя мастакі з Горак, хоць ніколі і не бачылі іх на свае вочы, але пасля вывучэння літаратуры і інтэрнэт-рэсурсаў дакладна і стыльна намалявалі заморскія лясы і іх насельнікаў.

Кіраўніца студыі мастацкай творчасці «Мастыхін» Алена Бруй паведаміла, што работы падлеткаў былі выстаўленыя ў муніцыпальнай бібліятэцы горада Сан-Паўла.

Гэта зусім не адзіны міжнародны праект, у якім бяруць удзел горацкія дзеці. Удзельнікі мастацкай студыі нядаўна дасылалі свае работы ў Малайзію на праект па мастацтве паштовых марак. Малюнкі з Горак былі выкладзены на сайце праекта.

Ілона ІВАНОВА.

ЮРЫДЫЧНАЕ ПОЛЕ ДЛЯ ІНТЭЛЕКТУАЛЬНЫХ СПАБОРНІЦТВАЎ

Студэнты Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта сталі пераможцамі Рэспубліканскай юрыдычнай алімпіяды ў камандным і індывідуальным заліках. Прычым ў індывідуальным заліку ў студэнтаў БДУ тры першыя прызавыя месцы. У камандным заліку за БДУ — дзве першыя пазіцыі (каманды «Just cause» і «Прававы аспект»). Трэцяе месца падзялілі каманда «Фартуна» Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь і каманда Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны «Lynces justae». Усяго ўдзел у юрыдычнай алімпіядзе, якая праводзіцца пад патранажам Міністэрства адукацыі, узялі 11 камандаў з 9 ВНУ краіны, у якіх ажыццяўляецца падрыхтоўка спецыялістаў у галіне прававазнаўства.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 6 красавіка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць у якасці прызоў гадзіннікі, футболкі, бейсболкі, тэлевізары «Віцязь» і халадзільнік. Розыгрыш прызоў праводзіцца **8 красавіка 2009 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **да 18 красавіка 2009 г.**

Атрымаць прыз можна ў рэдакцыі **да 20 чэрвеня 2009 г.** пры прад'яўленні квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года і пашпарта. Дастаўку тэлевізараў і халадзільніка ажыццяўляе рэдакцыя. **Пасля 20 чэрвеня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Тэрмін правядзення гульні — з 04.03.09 па 10.04.09.

Больш падрабязна правілы гульні «Падпішыся на «Звязду» чытайце ў нумары газеты за 4 сакавіка 2009 года. Удачы ў гульні!

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1339 ад 03.03.09 выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

7 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2009 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку_____

_____

Падпіска афармлена і аплачана ў_____
(аддзяленне сувязі)

_____**на II кв. або 1-е паўг. 2009 года**

Хатні адрас і тэлефон _____ _____
(індэкс)

_____

_____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

(індэкс выдання) _____ Колькасць камплектаў _____

на 2009 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды

(прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ПВ | месца | літар

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету **ЗВЯЗДА** з бясплатнымі ўкладкамі: (індэкс выдання) _____

«ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт: падпіскі _____ руб. Колькасць камплектаў _____
пераадрасоўкі _____ руб.

на 2009 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму

Куды

(прозвішча, ініцыялы)

(адрас)

(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

Піва — далей ад школы...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

МУЖЧЫНЫ ТАКСАМА ПЛАЧУЦЬ

Па звестках **Андрэя ТУРАЎЦА, дырэктара Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей,** сёння нельга сцвярджаць, што толькі адны жанчыны церпяць ад хатняга гвалту. Звароты ў цэнтр мужчын з просьбамі дапамагчы ім утаймаваць раз'юшаных прадстаўніц слабай паловы, пазбегнуць з іх боку гвалту не такія ўжо і рэдкія, як можа здацца. Да 30 % ад агульнай колькасці зваротаў у цэнтр — мужчынскія. Іх становіцца ўсё больш. Часцей за ўсё мужчыны перажываюць псіхалагічны гвалт — маўляў, не забяспечваеш сваю каханую жонку ці сяброўку на ўзроўні еўрапейскіх стандартаў. Зрэдку мужчыны церпяць ад фізічнага ці эканамічнага націску.

У многіх еўрапейскіх краінах па прыкладу Швецыі ідзе стварэнне так званых «тата-школ», у якіх маладыя бацькі вучацца правільна паводзіць сабе ў сям'і, кіраваць сваімі эмоцыямі, умець прыстасоўвацца да новых абставінаў, будаваць адносіны з дзецьмі і падлеткамі. Швецкі вопыт сябе поўнасцю апраўдаў. На думку дырэктара, наспеў час ужо ў нас адчыняць такія «тата-школы» для сямейнага выхавання бацькоў. Таксама, на думку Андрэя Тураўца, даўно наспела неабходнасць звярнуць асаблівую ўвагу на рэпрадукцыйнае здароўе хлопчыкаў і падлеткаў. Чамусьці рэпрадукцыйным здароўем дзяўчатак і дзяўчат у нас заклапочаны многія, а вось хлопчыкі і юнакі ў гэтым сэнсе нібы забытыя. А ў Еўропе пачалі выпраўляць сітуацыю ў сферы адносінаў да здароўя маладога мужчынскага пакалення.

ЯК ЗНЯЦЬ «ДУРНУЮ» ЭНЕРГІЮ?

Аляксандр САДОЎСКІ, дырэктар клуба аматарскіх адзінаборстваў, упэўнены ў тым, што толькі заняткамі спортам малады чалавек можа пазбавіць сябе ад уплыву залішняга адрэналіну, які спрыяе стварэнню агрэсіўнага настрою. Акрамя гэтага, пастаянныя заняткі спортам дысцыплінуюць юнака, дапамагаюць яму ў крызісных сітуацыях валодаць эмоцыямі, пазбягаць непапраўных крокаў і паводзінаў, ад якіх недалёка да правапарушэння ці злачынства. Таму, чым больш падлеткаў будуць займацца ў спартыўных секцыях (не важна, якім відам спорту), тым больш яны будуць вытрыманымі, адказнымі за свае паводзіны і лепш падрыхтаванымі да дарослага жыцця. Тым больш, што фізіялагічна мужчына, паведаміў Аляксандр Садоўскі, значна слабейшы за жанчыну. Напрыклад, болевы парог у мужчыны ніжэйшы ў пяць разоў, чым у жанчыны. А мужчыну часта даводзіцца паводзіць сябе ў жыцці менавіта як мужчыну, быць здатным на мужчынскія ўчынкі. А гэта вельмі няпроста. Таму, падкрэсліў яшчэ раз Аляксандр Садоўскі, універсальны спосаб самавыхавання для падлеткаў — спорт. Гэта парада, на яго думку, карысная і для дзяўчат, бо разумныя фізічныя нагрузкі дапамогуць не толькі трымаць фігуру ў норме, але і выхоўваць характар, вучыцца быць моцнай і незалежнай ад абставінаў.

І ЎРОКІ ХАРЭАГРАФІІ

Алёна ЗЯМНОВА, метадыст Мінскага ваеннага суворaўскага вучылішча, ганарыцца тым, што ёй пашчасціла працаваць у гэтай унікальнай у Беларусі навучальнай установе. Там, паводле яе слоў, імкнуцца прывіваць сваім курсантам сапраўды мужчынскія рысы характару, выхоўваць адданых абаронцаў радзімы. За гады існавання (вучылішча створана ў 1943 годзе) у вучылішчы склалася ўласная сістэма выхавання падлеткаў. Можа нехта здзівіцца, але ў яго вучэбных планах ёсць такі прадмет як этыка і псіхалогія сямейных адносінаў. Таксама важным і абавязковым элементам фарміравання гарманічнай асобы юнака з'яўляецца харэаграфія. Яе ўрокі станоўча ўплываюць на паводзіны хлопцаў. Невыпадкова суворaўскія балі папулярныя ў мінскай моладзі.

Для многіх яе прадстаўнікоў суворавец — узор паводзінаў, ён галантны кавалер з дзяўчатамі і ветлівы з хлопцамі, разумны і культурны суразмоўца, заўсёды чыста апрануты. Алёна Зямнова ўпэўнена, што яе выхаванцы не дапускаюць і ў думках не тое што гвалту над дзяўчынай, а нават нейкага непрыгожага ўчынку ў дачыненні да жанчыны. Гэтая выхаванасць і культура паводзінаў дэманструецца суворaўцамі штодзень. Нават у такіх дробязях, як саступіць жанчыне ці сталаму чалавеку месца ў транспарце, прапусціць іх наперад пры ўваходзе ў краму ці ўстанову.

Паліна ЛАХМАНЕНКА.

БЫЎ, ЁСЦЬ, БУДЗЕ!

Погляд на дату

«Про то, ко векуистой тое-то речи памяти, мы, Александр, Божьею милостью великій князь Литовскій, Рускій, Жомоитскій и иных, пан и дедич, чиним знаменито сим нашим листом, хто на него посмотрит, або чтучи его услышит, нынешним и потом будучим, кому будет потреба его ведати, иж маючи взгляд посполитого доброго розмноженья и хотечи положеньe места нашого Менского в мере лепшой поставити, абы люди наши, там мешкаючыи, через вряд добрый а справедливый были розмножены, тое место нашо Менск с права Литовского и Руского и которое коли будет там перьво держано, в право Немецкое, которое зоветься Майтборское, переменяем на вечныи часы».

(Прывілей Менску на Магдэбургскае права, Літоўская Метрыка, 14.03.1499 г.)

Кожны дзень шпацырую гэтымі вулачкамі, удыхаю водар гарадскога жыцця, праз прызму цікавасці назіраю за лёсам іншых гарадоў і мястэчак,.. але чамусьці не свайго. Чалавек па натуры сваёй здольны з большай павагай і захапленнем успрымаць тое, што далёка ад яго, тое, што, так і мроіцца, абавязкова прывядзе ў казачную быль. Так і я, які, па сутнасці, з'яўляецца карэнным менчуком, але ад чагосьці так мала ўзгадвае аб сваім родным Мінску...

Дзед майго дзеда збудаваў невялічкую хатку ў Менску на самым пачатку XX стагоддзя. Тады гэта была самая мяжа яшчэ зусім невялікага горада, а цяпер сапраўдны цэнтр. Пазней жа была акупацыя, калі маленькі домік, дзякуючы непападанню ў чорны спіс нявінных нумароў, ледзь захаваўся пасля забойства Кубэ; а далей быў паклёп, пажарышча... а ён усё стаяў, стаяў, як і сам Мінск. І сапраўды, чаму мы сваім «намыленым» вокам усе так шмат блукаем, фатаграфуем іншыя мясціны, а аб сваёй — там, дзе пражылі ўсё жыццё, — нават не ўзгадваем? Хацелася б, каб усё было не так, каб гучала яго слаўнае імя не толькі ў падручніках, але і падчас штодзённых размоваў... Дык давайце зробім хаця б адзін крок насустрач гэтаму — тым больш, што сёння, 27 сакавіка, — дзень 510-годдзя моцы нашай сталіцы!.. Калі казаць дакладна, менавіта ў гэты дзень, 14 сакавіка (па старым стылі), 1499 года атрымаў права на самакіраванне, што заклала падмурак для будучай сталіцы Беларусі...

Вядома, на самым пачатку ён не быў сталіцай, бо быў і памежным горадам магутнага Полацкага княства, і цэнтрам паветаў-ваяводстваў у Вялікім Княстве, і губернскім градам Расійскай імперыі, ды нават самастойнай дзяржавай. Рэч у тым, што па драбленні той самай полацкай «імперыі», адзін са спадкаемцаў трона, Глеб Менскі стварыў настолькі моцнае княства са сталіцай у Менску, што гэта прымусіла ўсіх кіеўска-наўгародскіх князёў аб'яднацца дзеля недапушчэння ўзнаўлення былой моцы беларускай зямлі... Але гэта ўжо гісторыя. Сённяшні ж Мінск з насельніцтвам блізу 2 мільёнаў чалавек займае належнае месца сярод еўрапейскіх «капітолій». «Горад чысціні» — так яго называюць замежныя госці. Калі ж зранку, гадзінцы так а пятай, прайсціся па цэнтры, то можна атрымаць вялікую асалоду ад убачанага: сярод пустога горада толькі вы, вы і той, хто вам патрэбны — а насустрач ратушы ды вежам фантастычных цэркваў і касцёлаў крочаць сонечныя «вусы», што так упарта граюць зайчыкамі на старажытнай брукаванцы.

Так, сапраўды чысты горад, але... рака Свіслач уваходзіць у спіс дзесяці самых забруджаных рэк свету! І, падаецца, пасля ўсенародных гулянняў на Дзень Незалежнасці або 1-га мая, яна ўпэўнена кожным разам займае першае «ганаровае» месца. Вось, здавалася б, аб чым клапаціцца трэба, дарагія менчукі-мінчане...

Дарэчы, гэтае пытанне ўжо даўно не дае спакою шматлікім жыхарам. Дык усё ж як варта Ме(і)нск пісаць? Чаму такое разгалінаванне атрымалася? На гэтае пытанне змогуць адказаць звычайныя літары кірылічнага і лацінскага алфавітаў. Калі дакладней, як нашае грамадства стала мець большыя стасункі з польскім (гадоў гэтак 300 таму) ды як ужо канчаткова перайшлі на польскую лацінку, то ранейшая назва «Менск» ператварылася ў польскую «Mіensk», бо па-польску «е» выглядае, як «іе». Ды і, тым больш, тады ўжо існаваў польскі гарадок Мінск, а таму і вырашылі ўсё, як звычайна, пад адну лыжку. Пазней, ажно да 1938 года, паралельна ўжываліся абедзве назвы: па-беларуску Менск, на рускай мове Мінск... Як бачу: з усёй пашанай моліцца багам стары волат-чараўнік Менеск — і правільна, бо магло ж дайсці да таго, што палякі выпадкова зрабілі б яго Меніскам, а рускія афіцыйна б замацавалі. І хадзіла б потым легенда, як каленныя храсткі заснавалі горад...

III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ			
Внереализационные доходы	130	—	4
Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы	131	—	—
Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы)	140	—	4
Внереализационные расходы	150	46	72
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) от внереализационных доходов и расходов	**160**	**-46**	**-68**
ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (70-120-160)	**200**	**790**	**915**
Налог на прибыль	250	199	233
Прочие налоги, сборы из прибыли	260	25	25
Прочие расходы и платежи из прибыли	270	—	—
ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-250-260-270)	**300**	**566**	**657**

Количество акционеров – 2. В том числе: физических лиц – 2.

ИНФОРМАЦИЯ О ДИВИДЕНДАХ И АКЦИЯХ

Наименование показателя	Един. изм.	За отчетный период	За аналогичный период прошлого года
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	Млн. руб.	43	12
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	Руб.	286	80
Обеспеченность акции имуществом Общества	Тыс. руб.	14246	10831
Количество простых акций, находящихся на балансе Общества	Штук	—	—
Информация о задолженности			
Просроченная дебиторская задолженность	Млн.руб.	—	—
Просроченная кредиторская задолженность	Млн. руб.	—	—
Среднесписочная численность работающих	Человек	142	144

Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, работ, услуг: **швейное производство.**

Данные отчетности подтверждены аудиторским заключением ИП Т.Л. Рабушка, лицензия № 02200/0495526 от 03.02.2009 г.

Руководитель **В.М. Катинель**
Главный бухгалтер **Т.В. Торубарова**

ААТ «ЛІДСКАЕ ПІВА» — З НОВЫМІ ІНВЕСТАРАМІ

Найстарэйшае беларускае прадпрыемства па вытворчасці пеністага піва, квасу і іншых папулярных у народзе напояў гэты год сустракае з вялікім інвестыцыйным пакетам. Яно ў найбліжэйшы час павінна асвоіць 20 мільёнаў еўра прамых фінансавых патокаў. Інвестыцыйная праграма прадугледжвае комплексную мадэрнізацыю вытворчасці, удасканаленне транспартна-лагістычных схем і адпрацоўку новых эфектыўных маркетынгавых інструментаў.

ААТ «Лідскае піва» з нядаўняга часу мае скандынаўскую «прапіску». Найбуйнейшым акцыянерам прадпрыемства стаў фінскі канцэрн «Olvi», які ўжо мае па адным аналагічным заводзе ў краінах Прыбалтыкі і ў Фінляндыі. Новы генеральны дырэктар ААТ «Лідскае піва» літовец Аундрус Мікшыс адзначыў, што дзякуючы інвестпраектам прадпрыемства плануе дасягнуць сваіх стратэгічных мэтаў на 2009 год, а менавіта: трывала замацавацца ў першай тройцы беларускіх вытворцаў піва і ўтрымаць абсалютнае лідарства ў сферы вытворчасці квасу браджэння. Пры гэтым сёлетнія аб'ёмы экспарту павінны падвоіцца, дасягнуўшы сумарнай лічбы ў 2 мільёны долараў ЗША.

Кіраўнік кампаніі Olvi Ласэ Ахо адзначыў, што рынкавыя пазіцыі канцэрна за апошні час значна ўзмацніліся: гандлёвы абарот у краінах прысутнасці — Літве, Латвіі, Эстоніі і Фінляндыі — вырас на 8,3 працэнта і дасягнуў 222 мільёнаў еўра. Але ж галоўнай падзеяй года стала пакупка 51 працэнта акцый «Лідскага піва» і выхад на новы рынак — беларускі.

Госць з краіны Суомі адзначыў, што кампанія Olvi і ААТ «Лідскае піва» амаль равеснікі — заснавальнікі Olvi Гідэон Оберг у Фінляндыі і лідскі мешчанін Носель Пупко варылі добрае піва ўжо 130 гадоў таму. Гэта дастатковы тэрмін для таго, каб стварыць уласныя стандарты якасці і навучыцца паважаць прафесійныя традыцыі адно аднаго.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

ВЕТСЛУЖБЫ БЕЛАРУСІ ВЫСВЯТЛЯЮЦЬ ПРЫЧЫНЫ АБМЕЖАВАННЯ ПАСТАВАК ПРАДУКЦЫІ Ў РАСІЮ

Аб гэтым паведаміла карэспандэнту БЕЛТА **прэс-сакратар Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Дар'я КАЗЛОЎСКАЯ.**

У Мінсельгасхарч Беларусі 19 сакавіка паступіла пісьмо ад Федэральнай службы па ветэрынарным і фітасанітарным наглядзе Расіі аб выключэнні пяці беларускіх сельгасарганізацый са спісаў прадпрыемстваў, што маюць права на экспарт сваёй прадукцыі ў Расію. Абмежаваны пастаўкі прадукцыі ААТ «Пружанскі малочны камбінат», ААТ «Кобрынская птушкафабрыка», ААТ «Маладзечанскі гармалзавод», ААТ «Нарачанскі масласырзавод» і ААТ «Чавускі масларобна-сыраробны завод».

УВАЖЛІВА ВЫВУЧАЙЦЕ РАСКЛАД

Паводле інфармацыі Мінскага аддзялення Беларускай чыгункі, 30 сакавіка і 2 красавіка электрацягнік Мінск, Інстытут культуры—Орша адпраўленнем на 10.42 у сувязі з працягам пуцявых работ будзе ісці да станцыі Крупкі.

У гэтыя ж два дні электрычка Орша—Мінск-Усходні адпраўленнем на 11.38 адмяняецца на ўчастку Орша—Крупкі і будзе ісці згодна са зменены раскладам: Крупкі — 13.57, Барысаў — 14.36-14.38, прыбыццё ў Мінск-Усходні ў 16.10.

Таксама 31 сакавіка для электрацягніка Мінск—Баранавічы адпраўленнем на 11.56 адмяняецца прыпынак на прыпыначным пункце Сталічны.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ВЫЗНАЧАНА ЛЕПШАЯ ПАШТОВАЯ МАРКА

З 16 лютага па 16 сакавіка 2009 года праводзілася апытанне-конкурс «Лепшая паштовая марка Рэспублікі Беларусь 2008 года». Аб гэтым паведамляе РУП паштовай сувязі «Белпошта» і выдавецкі цэнтр «Марка».

Усяго атрымана 877 анкет, але 21 была несапраўднай.

Пераможцам конкурсу стаў паштовы блок «1020-годдзе Х

ЁСЦЬ У ПОШТЫ МУЗЕЙ...

Леанід Аркадзьевіч і не думаў, што столькі пытанняў яму зададуць школьнікі Гомельшчыны, якія сабраліся ў абласным цэнтры краязнаўства і турызму. Іх цікавіла развіццё паштовай сувязі з сівых часоў да сённяшняга дня, і калі Ліхута пачаў сваю лекцыю з таго, што яшчэ ў глыбокай старажытнасці князі, цары і каралі пасылалі розныя весткі адзін аднаму або загады сваім падначаленым праз спецыяльных ганцоў, што ў Кіеўскай Русі была завядзёнка, каб сяляне давалі тым ганцам коней на працягу ўсяго маршруту, дык гэта было ўжо нішто іншае, як праявы паштовай дзейнасці. Дарэчы, у «Аповесці мінулых гадоў» аб падзеях 885 года ёсць такія радкі аб ганцах: «...паслаў Алег да радзімічаў, пытаючы...»

Лекцыя заняла часу каля гадзіны, і суправаджалася яна паказам паштовых экспанатаў, якія ў двух пакетах Ліхута прынёс з сабой, шкадуючы толькі аб тым, што куды цікавей было б для дзятвы, калі б яна аб усім гэтым не толькі пачула ў музеі Гомельскага філіяла РУП «Белпошта», але і пабачыла на свае вочы шматлікія рэчы і паштовыя дакументы, якія перадаюць дух сваёй эпохі. І ён запрасіў дзяцей прыйсці сюды з бацькамі, каб сяляне давалі тым ганцам коней на працягу ўсяго маршруту, дык гэта было ўжо нішто іншае, як праявы паштовай дзейнасці. Дарэчы, у «Аповесці мінулых гадоў» аб падзеях 885 года ёсць такія радкі аб ганцах: «...паслаў Алег да радзімічаў, пытаючы...»

— Ідэя стварэння паштовага музея, — расказвае Леанід Аркадзьевіч, — належыць дырэктару абласнога філіяла РУП «Белпошта» Міхаілу Кірыенку.

Адказным быў прызначаны Леанід Ліхута, майстар сувязі СССР. Давялося шукаць матэрыялы ў архівах, заклікаць работнікаў прыносіць экспанаты, якія маюць дачыненне да работы пошты. Сам ён, заўзяты калекцыянер, падарыў музею сваю калекцыю дарэвалюцыйных марак і паштовую картку з аўтографам Юрыя Гагарына, якую даслаў яму сябар, чый дзядзька працаваў на касмадроме.

А вось фотаздымак, на якім дзед Міхаіла Кірыенкі Цімафей Рыгоравіч, франтавы сувязіст Першай сусветнай, на Заходнім фронце ў Румыніі. Побач з ім — веласіпед цікавай канструкцыі. Тут — масіўны нагрудны знак паштовага служачага на чыгунцы другой палавіны XIX стагоддзя. Датаваны ён 1869 годам. Ёсць машынка для сартавання манет, першыя

Падводзячы да гэтых экспанатаў, начальнік вытворча-тэхнічнай лабараторыі Наталля БАКУШ зазначыла: усе яны з інтэр'ера паштовага вагона мінулага стагоддзя. Франтавы сувязіст Цімафей КІРЫЕНКА (здымак 1914 года). Такі нагрудны знак насіў паштовы служачы сто пяцьдзесят гадоў таму. Гэта паштовая марка ў дарэвалюцыйным Гомелі была не кожнаму па кішэні. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

лічыльныя машынкі, даўнія штэмпелявальныя машынкі, гадзіннік і ліхтар з паштовага вагона, калекцыя штэмпеляў рознай канфігурацыі, сургучніца, зробленая з азбацэментнай трубы і г.д.

Нельга не звярнуць увагу і на паштовую дакументацыю, якая пасля ваеннага ліхалецця вялася на газетнай і трафейнай паперы, на Ганаровую грамату Народнага камісарыята сувязі СССР, якой у 1945 годзе была ўзнагароджана Ельская райкантора сувязі за лепшыя паказчыкі ў працы.

Ды ўсё і не пералічыць. Тым больш, што шырока дэманструецца і сённяшні дзень работы калектыву філіяла. Як гаворыць яго дырэктар Міхаіл Кірыенка, сучасная пошта мае разнастайныя сродкі транспарціроўкі, аўтаматызаваную сістэму апрацоўкі карэспандэнцыі... А ўсё пачыналася з тых ганцоў, пра якіх ішла гаворка ў пачатку артыкула, ды паштовай карэты, запрэжанай коньмі, якая ў любое надвор'е спяшалася з весткамі ад аднаго населенага пункта да другога.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

РАБІНАВАЯ НОЧ ВАЛЕРЫЯ МАРАКОВА

27 сакавіка спаўняецца 100 гадоў са дня нараджэння беларускага паэта 20-30-х гадоў Валерыя МАРАКОВА.

Імя гэтага чалавека, расстралянага ў 1937 годзе ва ўзросце 27 гадоў, было вернутае з небыцця амаль выпадкова.

— У канцы жніўня 1997 года мне пазванілі з выдавецтва «Мастацкая літаратура». Пацікавіліся: ці не захаваліся ў нас у сям'і — можа нейкім цудам? — рукапісы майго дзядзькі — паэта Валерыя Маракова, — узгадвае Леанід Маракоў, сёння таксама вядомы літаратар. — Я адказаў «Не захаваліся», а сам сябе, нібы прачнуўшыся, спытаў: «А дзе маглі захавацца?» І паспрабаваў адказаць.

Пляменнік паэта, на той час паспяховы бізнэсмен, Леанід Маракоў рукапісаў дзядзькі, пра якога дагэтуль нічога не ведаў, не знайшоў ні ў адным з беларускіх архіваў. Аднак у сваіх старанных пошуках ён натрапіў на звесткі, якія раз і назаўсёды змянілі не толькі яго жыццё, але ў многім і наша ўяўленне пра айчынную гісторыю.

Праз два гады на свет з'явілася кніга «Валеры Маракоў: Лёс, хроніка, кантэкст», якую літаратуразнаўцы адразу назвалі ўнікальнай. У ёй было сабрана практычна ўсё, што Леаніду Маракову ўдалося знайсці пра свайго дзядзьку, яго час і людзей, якія падзялілі з ім лёс, пра яго сяброў і ворагаў. Успаміны і фрагменты даследаванняў, рэцэнзіі, артыкулы і дакументы, якія раней ніколі не друкаваліся: пратаколы арыштаў і прысудаў, сведчанні пра фізічнае і маральнае катаванне выдатных беларускіх пісьменнікаў. У выніку атрымаўся страшны летапіс знішчэння эліты беларускай інтэлігенцыі.

Аднак гэта было толькі пачаткам. Біяграфічны даведнік пра Валерыя Маракова стаў асновай для складання зборніка імёнаў рэпрэсіраваных беларускіх дзеячаў культуры «Вынішчэнне», які ўбачыў свет

у 2000 годзе. На сённяшні дзень пляменнік паэта выдаў 26 кніг, з іх 15 — біяграфічныя даведнікі рэпрэсіраваных у Беларусі ў перыяд з 20-х па 50-я гады мінулага стагоддзя людзей: святароў, навукоўцаў, дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, настаўнікаў, пісьменнікаў... Такім чынам імя паэта Валерыя Маракова паслужыла штуршком для вяртання тысяч і тысяч імёнаў, аднаўлення знявечаных лёсаў, адкрыцця невядомых альбо малавядомых старонак нашай гісторыі.

Валерый Маракоў нарадзіўся простай сям'і, пасля заканчэння сямігодкі ён працаваў разам са сваім бацькам мулярам. Яго бацька на мяжы стагоддзяў прыехаў у Беларусь з Пскоўскай губерні, пасяліўся ў мястэчку Козырава Мінскага павета (цяпер раён Лошыцы ў Мінску), быў царкоўным старастам і адным з арганізатараў рэлігійнай антысавецкай арганізацыі ў 1933-1935 гадах. «Яны сапраўды адгаворвалі сялян ад калгасаў», — кажа Леанід Маракоў.

Валерый пачаў друкаваць свае вершы з 16 гадоў. У тым жа ўзросце быў прызначаны сакратаром рэдакцыі часопіса «Піянер Беларусі». Першы зборнік яго вершаў «Пялёсткі» быў выдадзены аб'яднаннем «Маладняк» у 1926 годзе. Вось як узгадвае пра той час паэт Алесь Звонак: «Прыехаўшы па нейкіх рэдакцыйных справах у Менск, я сустрэў Валерыя Маракова. Быў ён без пэўных заняткаў, пакрысе друкаваўся, рыхтаваў да друку другую сваю кніжку паэзіі «На залатым пакосе», матэрыяльна быў не забяспечаны, вяртацца на бацькаўскую мулярку не хацелася, прывязваў тэхнікум... Ня трэба забывацца на тое, што ў тыя гады існавала беспрацоўе. Я запрасіў Маракова прыехаць часова ў Полацк, папрацаваць, падправіць сваё матэрыяльнае становішча.

Неўзабаве ён прыехаў у Полацк. Тады Полацк і шэраг раёнаў Віцебшчыны былі далучаныя да БССР, установы ўсе пераводзіліся на дзяржаўную мову Беларусі, стваралася амаль пры кожнай установе гурткі па вывучэньні беларускай мовы. Вось тут Маракову была неабмежаваная педагагічная практыка як студэнту Менскага белпедтэхнікуму»...

Ён быў прыгожы, таленавіты і шматабяцальны. «Маракоў вызначаецца лірычнасцю, эмацыйнай напружанасцю, гучальнасцю сваіх вершаў, — пісаў пра маладога паэта М. Гарэцкі. — У яго шмат пачуцця, ён любіць яскравыя фарбы і гучанне». «Маракова заўважыў і акрыліў бацькоўскай ласкай і прыхільнасцю Янка Купала», — успамінаў пазней С.Шушкевіч.

Пры жыцці выйшлі яшчэ два яго зборнікі: «Вяршыні жаданняў» (1930) і «Права на зброю» (1933). Яго арыштоўвалі двойчы: у сакавіку 1935-га і 6 лістапада 1936-га.

— У апошнім выпадку магло мець месца ўзброенае супраціўленне, — з гонарам распавядае пляменнік Валерыя Маракова. — Потым, тыя, хто яго ведаў, расказвалі, што паэт, калі ад'язджаў з Мінска на раён, узяў з сабой наган і сказаў, што будзе бараніць сябе. Але ён не паспеў выкарыстаць зброю, якая была хутчэй за ўсё схавана на яго кватэры ў Барысаве. Яго арыштавалі на Мінскім вакзале.

28 кастрычніка 1937 года, пасля года катаванняў, знявечанага паэта Маракова тройка НКВД асудзіла (пасяджэнне працягвалася 15 хвілін) як «члена контррэвалюцыйнай нацыянал-фашысцкай арганізацыі» да вышэйшай меры пакарання з канфіскацыяй маёмасці. У тую страшную ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года ў Мінску былі знішчаны каля ста дзеячаў беларускага грамадства і культуры. Сярод іх 22 — пісьменнікі.

— Мне ўдалося даведацца, што гэтых людзей першапачаткова не збіраліся расстрэльваць, — распавядае Леанід Маракоў. — У адным з маскоўскіх архіваў я знайшоў тэлеграму-запыт, датаваную пачаткам восені 1937 года. Палкоўнік КДБ з Мінска пытаецца: «Што з імі рабіць?» Маўляў, за год мы іх усіх так знявечылі, што іх нельга ні выпусціць, ні адправіць у лагеры. Пасутнасці іх забілі, каб знішчыць сляды катаванняў на іх целах і ліквідаваць сведак свайго беззаконня.

Валерый Маракоў быў рэабілітаваны ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 23 красавіка 1957 года.

Пасля смерці выйшлі тры зборнікі яго вершаў. Два — у юбілейныя 1959 і 1989 гады. Апошні — у 2003-м. Ён называецца «Рабінавая ноч», як і паэма паэта, якая пакуль так і не знойдзена (уступ да яе надрукавала 25 лістапада 1928 года «Чырвоная Змена»), бо хутчэй за ўсё была знішчана супрацоўнікамі НКУС пры арышце.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.55	18.36	12.41
Віцебск —	5.44	18.26	12.42
Магілёў —	5.45	18.26	12.41
Гомель —	5.43	18.21	12.38
Брэст —	6.10	18.51	12.41
Гродна —	6.12	18.51	12.39

Месяц

Апошняя квадра.
Месяц у сузор'і Авена.

Імяніны

Пр. *Венядзікта, Расціслава.*
К. *Лідзіі, Бенядзікта, Мацея, Эрнеста, Яна.*

Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра

Дзве даты

27 сакавіка

1480 год — нарадзіўся Ян Вісліцкі, беларускі паэт-лацініст. Скончыў Ягелонскі ўніверсітэт у Кракаве. Выступаў у пашыраных на той час у свецкай літаратуры жанрах — ода, эпіграма, элегія, пасланне. Пісаў творы на лацінскай мове. Аўтар гістарычнай паэмы «Пруская вайна» (1516 г.). Паэма стаіць ля вытокаў жанру эпапеі ў беларускай, польскай і літоўскай літаратурах.

1968 год — падчас трэніровачнага палёту ў авіяцыйнай катастрофе загінуў першы касманаўт планеты Юрый Гагарын.

Цытата дня:

«У жыцці кожнай жанчыны ёсць два галоўныя мужчыны: той, за якога яна выйшла, і той, за якога выйсці не ўдалося».

Роберт Лембке (1913—1989), нямецкі журналіст.

КОЛА

Кола ў культуры ўсходніх славян заўсёды сімвалізавала Сонца, рух і аднаўленне. Здавён рух у часе суадносіўся з колам, казалі — «кола часу», «кола жыцця» ці «закруціўся, як белка ў коле». Крыж (спіцы) у коле (крузе) сімвалізаваў чацвяртное дзяленне, што адпавядала гадавому цыклу — чатыром порам году. У старажытныя часы кола дазволіла вырабляць сродкі руху. У той жа час кола вельмі часта прысутнічала ў абрадах і рытуалах.

● На Масленку на высокай жардзіне мацавалі кола, якое сімвалізавала гадавы цыкл, і пасля гульняў яго абавязкова спальвалі, тым самым як бы паскараючы доўгачаканы надыход цяпла.

● Палаючыя колы былі сімвалам Сонца, якое коцілца па небасхіле. Іх пускалі з гары ў дні святкавання летняга сонцастаяння — на Купалле. Старыя колы спальвалі ў купальскім вогнішчы.

● Катанне палаючых колаў з гор часта набывала ахоўную функцыю ад нячыстай сілы. Так, у некаторых рэгіёнах такія колы пушчалі на Юрая — тым самым ахоўвалі палі і статкі ад сурокаў.

● На Гомельшчыне існавай звычай на Іванаў дзень абкатаць хату і пабудовы колам, затым замацаваць яго на доўгі шэст і пакінуць так да наступнага года. Так гаспадар хаты ахоўваў сваю гаспадарку «ад каршака, непрыемных людзей, ад звярэй...»

● Кола, якое выступала абярэгам гаспадаркі ад нястачаў, драпежных звяроў і г.д. усталёўвалі на Благавешчанне, на Юрая, на Купалле. Часам гэты абрад выконвалі ў дзень Ушэсця (28 жніўня) — у гонар заканчэння сельскагаспадарчых работ на гародзе і ў полі.

● Кола часта было адным з атрыбутаў лячэбнай магіі і ў час варожбаў: праз спіцы кола пераносілі, пасоўвалі, перакідвалі пэўныя рэчы.

● Колы замацоўвалі на хатніх дахах ці на дрэвах, каб буслам — птушкам-сімвалам шчасця і дабарабыту — было зручна будаваць свае гнёзды.

У той жа час, кола, якое рухаецца, выклікала насцярожанасць. Існаваў шэраг забаронаў, звязаных з рухомым колам.

● Напрыклад, незамужняй дзяўчыне забаранялася ставіць нагу на кола: «інакш колькі спіц у коле, столькі гадоў не будзе дзяцей».

● Салам, якім мазалі колы, можна было выклікаць вар'яцтва ў сабакі.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

РЭПУТАЦЫЯ НАДЗЕЙНАГА ПАРТНЁРА

Паводле інфармацыі Нацыянальнага банка Рэспублікі Беларусь, у беларускіх банках укłады фізічных асобаў у пераліку на нацыянальную валюту ўпершыню перавысілі 15 трыльёнаў рублёў. За 2 месяцы гэтага года яны павялічыліся амаль на 1,8 трыльёна рублёў, або на 13,4 працэнта.

ААТ «Беларускі Індустрыяльны Банк» з лістапада мінулага года пачаў прымаць ва ўклады свабодныя грашовыя сродкі насельніцтва. Прывабныя ўмовы дазволілі банку дастаткова хутка нарасціць дэпазітны партфель фізічных асобаў, і на 1 студзеня 2009 года ён склаў 6,9 млрд у рублёвым эквіваленце. Па стане на 25 сакавіка гэтага года дэпазіты фізічных асобаў у рублёвым эквіваленце дасягнулі 26,6 млрд. Банк упэўнена заняў сваю нішу ў гэтым сегменце рознічных паслуг.

Паводле слоў спецыялістаў аддзела дэпазітаў ААТ «Беларускі Індустрыяльны Банк», асаблівай папулярнасцю ў насельніцтва карыстаецца ўклад «Рублёвы» ў беларускіх рублях на 2 месяцы з фіксаванай даходнасцю 25 % гадавых. Мінімальная сума — 5,0 млн руб., прадугледжана магчымасць штомесячнага зняцця працэнтаў. Пры датэрміновым скасаванні працэнтная стаўка складае 14 % гадавых. Банк прыцягвае грашовыя сродкі насельніцтва і ў замежнай валюце. Так, даходнасць па ўкладзе «Рэкамендаваны» ў доларах ЗША і еўра тэрмінам на год складае 12 % гадавых. Мінімальны памер укладу — 2 000 долараў ЗША або еўра. Стаўка па гэтым укладзе плаваючая, без капіталізацыі працэнтаў, пры датэрміновым скасаванні не пералічваецца.

Але не толькі выгадныя ўмовы па дэпазітах прывабліваюць фізічных асобаў, лічаць у ААТ «Беларускі Індустрыяльны Банк». Найперш людзей цікавіць дзейнае заканадаўства ў частцы гарантыі захаванасці зберажэнняў і, безумоўна, надзейнасць крэдытна-фінансавай установы, дзе будуць захоўвацца зберажэнні, рэпутацыя на рынку і фінансавыя паказчыкі дзейнасці. У нашай краіне створаны вельмі выгадныя для ўкладчыкаў умовы зберажэнняў. Згодна з Дэкрэтам Прэзідэнта РБ ад 4 лістапада 2008 г. № 22 «Аб гарантыях захаванасці грашовых сродкаў фізічных асобаў, размешчаных на рахунках і (або) у банкаўскія ўклады (дэпазіты)» прадугледжана поўная захаванасць зберажэнняў насельніцтва ва ўсіх банках краіны. Акрамя гэтага, згодна з дзейным у Рэспубліцы Беларусь заканадаўствам, даходы фізічных асобаў ад размяшчэння грашовых сродкаў у банкаўскіх укладах не абкладаюцца падаткамі.

Алена АНІНА.

ВЫКЛЮЧАЙЦЕСЯ РАЗАМ З УСЁЙ ПЛАНЕТАЙ!

28 сакавіка Сусветным фондам дзікай прыроды (WWF) запланавана правядзенне глабальнай акцыі «Гадзіна Зямлі».

Каля 1 мільярда чалавек больш чым у тысячы найбуйнейшых гарадоў планеты выключаць на гадзіну свята (з 20.30 да 21.30 па мясцовым часе), каб прадэманстраваць палітыкам сваю занепакоенасць небяспечнымі наступствамі змянення клімату. У снежні 2009 года ў Капенгагене краіны-ўдзельніцы Кіёцкага пратакола павінны падпісаць новы глабальны дагавор, які вызначыць дзеянні па барацьбе са змяненнямі клімату да 2020 года. Выключыўшы святло на адну гадзіну, людзі такім чынам прагаласуюць за значнае зніжэнне выкідаў парніковых газаў...

Упершыню «Гадзіна Зямлі» была праведзена ў Сіднэі ў 2007 годзе, і яе падтрымалі больш за два мільёны чалавек. Але ўжо праз год гэта акцыя пераўтварылася ў падзею планетарнага маштабу і прыцягнула каля 100 мільёнаў удзельнікаў у 35 краінах свету.

Аб сваім намеры далучыцца да «Гадзіны Зямлі» ў 2009 годзе ўжо заявілі Ганконг, Чыкага, Капенгаген, Дубай, Стамбул, Лас-Вегас, Ліса-бон, Лондан, Лос-Анджэлес, Осла, Сінгапур, Сідней, Таронта і іншыя. У Расіі вядзецца падрыхтоўка ў Маскве, Уладзівастоку, Архангельску, Санкт-Пецярбургу і іншых гарадах. Згоду на ўдзел у акцыі дала кампанія Mirax, якая выключыць падсветку сваіх комплексаў «Масква-Сіці» з вежай «Федэрацыя» і «Міракс-Плаза». 28 сакавіка на гадзіну згасне падсветка гіганцкай статуі Хрыста над Рыа-дэ-Жанейра, Сталовай гары ў Кейптауне, агні на будынку самага высокага гатэля ў свеце (Бурж Дубай), а таксама ў Сіднейскім оперным тэатры. Святло выключыць у сваіх замках кароль Швецыі Карл Густаў XVI і прэзідэнт Італіі Джорджа Напалетана — у сваёй рэзідэнцыі ў Рыме.

У Беларусі арганізацыяй акцыі займаецца экалагічнае таварыства «Зялёная сетка», якое звярнулася ў міністэрствы і ведамствы, абласныя і раённыя адміністрацыі, да кіраўнікоў буйных прамысловых прадпрыемстваў і рэктараў ВНУ з заклікам далучыцца да ўсёй планеты. Па інфармацыі Беларускага зялёнага партала, свой удзел у акцыі ўжо пацвердзілі рэгіянальныя аддзяленні Дэпартамента па энергаэфектыўнасці Дзяржстандарта Рэспублікі Беларусь, прадпрыемствы лясной гаспадаркі, міністэрстваў архітэктуры і будаўніцтва, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, гандлю, эканомікі, Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях, Дзяржаўны пагранічны камітэт, Мінскі маторны завод, ААТ «Амкадор», рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Медтэхніка», ААТ «Пінскдрэў», ААТ «Рэчыцадрэў», «Івацэвічыдрэў», «Бабруйскмэбля», ААТ «Камунарка», ЗП «Кока-Кола Беўрыджыс Беларусь», ААТ « Гродна Азот», агульнаадукацыйныя школы, Міжнародны экалагічны ўніверсітэт імя Сахарава, Акадэмія кіравання, Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт, Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт і іншыя. Прыняць удзел у акцыі можа любы беларус, адключыўшы 28 сакавіка на адну гадзіну электрычнасць у сваёй кватэры...

Надзея НІКАЛАЕВА.

БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК

УТВЕРЖДЕНО:
Решением Наблюдательного Совета
ОАО «Белорусский Индустриальный Банк»
Протокол № 6 от 12.02.2009 г.

КРАТКАЯ ИНФОРМАЦИЯ

ОБ ОТКРЫТОЙ ПРОДАЖЕ ОБЛИГАЦИЙ ТРЕТЬЕГО ВЫПУСКА ОТКРЫТОГО АКЦИОНЕРНОГО ОБЩЕСТВА «БЕЛОРУССКИЙ ИНДУСТРИАЛЬНЫЙ БАНК»

1. Наименование эмитента на белорусском и русском языках.
На белорусском языке:
полное — адкрытае акцыянернае таварыства "Беларускі Індустрыяльны Банк";
сокращенное — ААТ "Беларускі Індустрыяльны Банк".
На русском языке:
полное — открытое акционерное общество "Белорусский Индустриальный Банк";
сокращенное — ОАО "Белорусский Индустриальный Банк".

2. Дата и номер государственной регистрации эмитента как юридического лица, наименование регистрирующего органа, дата основания.
Открытое акционерное общество "Белорусский Индустриальный Банк" зарегистрировано Национальным банком Республики Беларусь 30 октября 1991 года под номером 23. Банк является правопреемником общества с ограниченной ответственностью Коммерческий банк "Профбанк" (Протокол № 1 собрания учредителей от 30 мая 1995 года).

3. Место нахождения эмитента, юридический и почтовый адрес, телефон, факс, электронный адрес (e-mail).
Юридический и почтовый адрес: 220004, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Мельникайте, 8, тел./факс (8 017) 209-41-85, адрес в интернете: www.bib.by, e-mail: *bib@bib.by*.

4. Номера расчетного и валютного счетов эмитента, на которые будут зачисляться средства, поступающие при открытой продаже облигаций.
№ 0104604418 в VTB Bank (Deutschland) AG (г. Франкфурт-на-Майне) SWIFT: OWHBDEFF
(счет VTB Bank (Deutschland) AG в банке-корреспонденте: № 10961534 Citibank N.A., New York, SWIFT: CITIUS33)
№ 1701792014001 в ОАО "Белвнешэкономбанк" (г. Минск), SWIFT: BELB BY 2X (для расчетов по РБ).

5. Сумма зарегистрированного уставного фонда, количество акций по категориям и типам привилегированных акций.
Сумма зарегистрированного уставного фонда составляет ***20 125 307 930*** *(Двадцать миллиардов сто двадцать пять миллионов триста семь тысяч девятьсот тридцать) белорусских рублей.*

6. Наименование периодического печатного издания, в котором публикуется бухгалтерская отчетность эмитента.
Годовой отчет эмитента, бухгалтерский баланс, отчет о прибыли и убытках периодически публикуется в газете "Звязда", также с данной информацией можно ознакомиться на сайте ОАО "Белорусский Индустриальный Банк" по адресу: www. bib.by.

7. Место, время и способ ознакомления с более подробной информацией (проспектом эмиссии).
Ознакомиться с подробной информацией о выпуске облигаций можно начиная с даты публикации в средствах массовой информации текста краткой информации об открытой продаже облигаций по адресу:
• в головном офисе ОАО "Белорусский Индустриальный Банк" по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 8 с ***10.00*** до ***16.00***;
• на интернет-сайте эмитента: www.bib.by.

8. Дата принятия решения о выпуске облигаций, номер протокола и наименование органа, принявшего это решение.
Решение о третьем выпуске облигаций принято Наблюдательным Советом ОАО "Белорусский Индустриальный Банк" "12" февраля 2009 года, Протокол № 6 .

9. Объем эмиссии, количество, форма и вид выпуска облигаций и связанные с ними права.
Объем эмиссии составляет — ***5 000 000*** *(Пять миллионов) долларов США.*
Количество облигаций — ***5 000*** *(Пять тысяч) именных дисконтных бездокументарных облигаций.*
Серия ***«БІ-3»***, номера ***«000001-005000»***.
Облигации выпускаются в виде записей на счетах. Владелец облигаций имеет право на получение номинальной стоимости (основного долга), выплачиваемой при погашении облигаций.

10. Номинальная стоимость облигаций.
Номинальная стоимость облигаций — ***1 000*** *(Одна тысяча) долларов США.*

11. Цель выпуска облигаций.
Облигации выпускаются для привлечения свободных денежных средств юридических лиц.

12. Период проведения открытой продажи облигаций.
Дата начала продажи: ***01 апреля 2009 года.***
Дата прекращения продажи: ***30 июня 2009 года.***
Срок обращения облигаций: ***с 01 апреля 2009 года по 01 апреля 2010 года (365 дней).***

13. Место и время открытой продажи облигаций.
Открытая продажа (размещение) осуществляется:
• на внебиржевом рынке по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 8 ежедневно в течение банковского дня на основании договора открытой продажи (размещения) облигаций;
• на биржевом рынке в торговой системе ОАО "Белорусская валютно-фондовая биржа" в соответствии с регламентом торгов.

14. Срок обращения облигаций и период начисления процентов.
Срок обращения облигаций: ***с 01 апреля 2009 года по 01 апреля 2010 года (365 дней).***
Дата погашения облигаций: ***01 апреля 2010 года.***
Период начисления процентов: ***с 01 апреля 2009 года по 01 апреля 2010 года (365 дней.)***

15. Дата начала погашения и порядок погашения облигаций.
Погашение облигаций осуществляется по адресу: г. Минск, ул. Мельникайте, 8 в ОАО "Белорусский Индустриальный Банк" с ***10.00*** до ***16.00*** в рабочие дни, начиная с ***01 апреля 2010 года.***
Погашение облигаций осуществляется в отношении лиц, указанных в реестре владельцев облигаций, сформированном депозитарием эмитента на дату, следующую за датой закрытия реестра.
Дата закрытия и формирования реестра владельцев облигаций ОАО "Белорусский Индустриальный Банк" — **5 рабочих дней** до наступления срока погашения облигаций. Со дня закрытия реестра владелец облигаций обязан прекратить все сделки с облигациями.
Эмитент осуществляет списание денежных средств со своего счета по реквизитам владельцев в день погашения облигаций. Погашение облигаций производится денежными средствами в сумме и валюте номинала облигаций. Списание денежных средств производится по реквизитам последнего держателя, указанного в реестре владельцев облигаций ОАО "Белорусский Индустриальный Банк" на дату закрытия реестра.
Обязанности по погашению облигаций считается исполненной с момента списания денежных средств со счета эмитента по реквизитам владельцев облигаций.

16. Размер или порядок определения размера дохода по облигациям, условия его выплаты.
Доходность по размещаемому выпуску облигаций — **12 %** годовых при размещении "до погашения" на первичном рынке. Выплата дохода по дисконтным облигациям осуществляется единовременно, при погашении облигаций.
Дисконтные облигации продаются по стоимости ниже номинальной и погашаются по номинальной стоимости.
Размер дохода по облигациям определяется как разница между номинальной стоимостью и ценой приобретения облигаций.

17. Условия и порядок возврата средств инвесторам при запрете выпуска облигаций.
Эмитент производит возврат денежных средств не позднее 10 рабочих дней со дня запрета или приостановки выпуска облигаций Департаментом по ценным бумагам Министерства финансов Республики Беларусь.

18. Дата и номер государственной регистрации облигаций.
№ 5-200-02-0246 от "24" марта 2009 года.

19. Информация об обеспечении облигаций.
Облигации выпускаются без обеспечения в соответствии с п. 1.8. Указа Президента Республики Беларусь № 277 от 28 апреля 2006 года по согласованию с Национальным банком Республики Беларусь.
В соответствии с действующим законодательством общий размер обязательств по облигациям не должен превышать восьмидесяти процентов от суммы нормативного капитала. Эмитент выпускает облигации в пределах данных ограничений.

20. Порядок перехода прав собственности на облигации на вторичном рынке ценных бумаг, условия конвертации, условия и порядок досрочного погашения облигаций.
Эмитент имеет право выкупить свои облигации для перепродажи или досрочного погашения. Облигации могут быть досрочно погашены по решению эмитента. При принятии эмитентом положительного решения оплата производиться в течение 10 рабочих дней с момента подачи заявки на досрочное погашение.
Совершение сделок купли-продажи для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей, не являющихся профессиональными участниками рынка ценных бумаг Республики Беларусь, осуществляется на внебиржевом рынке в соответствии с законодательством Республики Беларусь. Для юридических лиц и профессиональных участников рынка ценных бумаг сделки купли-продажи осуществляются на биржевом рынке в порядке, установленном открытым акционерным обществом "Белорусская валютно-фондовая биржа".
Конвертация облигаций не производится.

Председатель Правления **Киреев А.Е.**
Главный бухгалтер **Кузьмицкая Н.А.**

Лицензия на осуществление банковской деятельности НБ РБ № 20 от 13.11.2008 г. УНП 100195493

Усміхнёмся!

Канчатковую перамогу над тэрарызмам можна будзе святкаваць толькі тады, калі атрымаецца злавіць Усаму бен Ладэна і яшчэ адну гадзіну, якая гадзіць у мяне дома ў ліфце.

☺

Мужчына з вытанчаным густам шукае дзяўчыну 92,34x61,71x93,45.
Не зануда.

☺

Мужчына на рынку купляе кабачкі. Прадаўцу:
— Гэта ў цябе самцы або самкі?
— ???!
— Мне трэба, каб з ікрой былі...

☺

Тэлевізар стаяў на кухні, жонка скардзілася, што па вечарах яго глядзіць і міжвольна есць. Паўнее. Купілі другі тэлевізар, у пакой. Зараз яна просіць купіць у пакой невялікі халадзільнік.

☺

Аб'ява ў газеце.
Шукаю мужа, які курыць, п'е, гуляе!
Лічу, што ў супругаў павінны быць агульныя інтарэсы!

ПАНЯДЗЕЛАК, 30 САКАВІКА

5.30 Дак. серыял «Таямнічы свет жывёлаў».
6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.05, 7.05, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 1.55 Зона Х.
7.30, 8.25, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.30 У свеце матораў.
9.05, 15.25 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10 Nota Bene.
9.35 Здароўе.
10.05 Жаночае ток-шоу «Жыццё як жыццё». «Я баюся стаць мамай».
11.05, 17.50 Серыял «Родныя людзі».
12.10 Меладрама «Жаночая інтуіцыя-2».
14.30 «Будні чэмпіёнаў». Браты Багдановічы.
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.30 Культурныя людзі.
16.05 Гульнявое шоу «Інтуіцыя».
16.50 Серыял «Гарачы лёд».
19.35 «Арэна».
19.55 Ток-шоу «Ход у адказ».
21.00 Панарама.
21.50 «Па-за законам». «Анёлы смерці».
22.20, 2.15 Серыял «Доктар Хаўс».
23.30 Трылер «Ідэальны свет».
2.00 Дзень спорту.

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 22.50, 0.35 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 Контуры.
10.10 «Дыханне планеты».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.05, 0.50 Навіны спорту.
11.10 «Кантрольная закупка».
12.00 «Малахаў+».
13.10 «Зразумець. Дараваць».
13.45 «Модны прыгавор».
15.00 «Ералаш».
15.20 «Рэкламная паўза».
16.15 «Песні маёй краіны».
18.20 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».
18.55 «Чакай мяне».
20.00 Час.
21.05 Ток-шоу «Выбар».
22.00 Серыял «След».
23.10 «Адваротны адлік». «Песняры. Спынены палёт».
23.40 Прафесійны бокс. Энтані Пітэрсан — Хаўер Хаўрэгі.

6.55 Ранішняя падзарадка.
7.55, 16.40 Смачна з Барысам Бурдой.
8.25 Тэлебарометр.
8.40 Усё пра бяспеку.
9.10 У гэты дзень.
9.15 Гадзіна суда. Справы сямейныя.
10.10, 17.10 Серыял «Спадчынніца».
11.00 Меладрама «Дарога да дома».
12.30 Гаспадар.
13.00 Серыял «Расплата за грахі».
13.50 Бухта капітанаў.
14.30 Пазакласная гадзіна.
14.45 «Тайны смак».
15.15 Экспедыцыя.
15.45 Гадзіна суда.
18.10 Навіны культуры.
18.25 Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Плэй-оф. Фінал.
20.50 Калыханка.
21.05 Экспедыцыя.
21.10 Беларуская часінка.
22.10 Серыял «Забойная сіла-6».
0.10 Хакей. Формула гульні.

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.40 «Раніца. Студыя добрага настрою».
8.30 «Тыдзень».
9.30 «Вялікае сняданне».
10.00 «Пяць гісторый».
10.55 Серыял «Танга ўтраіх».
11.45, 18.30 Серыял «Багатая і любімая».
12.40, 17.30 «Званая вячэра».
13.50 Маст. фільм «Браты — супернікі».
15.35 «Я — вандроўнік».
16.00 «Культурнае жыццё».
16.50 «Спартыўны тыдзень».
17.10 «Наша справа».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
20.15 «Добры вечар, малы».
20.35 Маст. фільм «Нічога асабістага».
23.00 «Сталічны футбол».
23.30 Серыял «Салдаты. Новы прызыў».
0.25 «Гучная справа».

5.00, 6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 0.00, 1.00 Навіны Садружнасці.
5.05, 6.05 Садружнасць live.
5.30 «Культурны слой з Львом Лур'е».
6.35 «Удачная пакупка».
6.45 «Цік-так».
7.05 «Лёгкае жыццё».
7.30, 19.30 «Агульны інтарэс».
8.05, 1.45 «Жывая гісторыя».
9.05 «Разам».
10.05 Маст. фільм «Гульні дарослых дзяўчынак».
12.05, 0.05 Маст. фільм «Капітан Нэма».
14.05 Мультфільм «Снежная каралева».
14.30 Серыял «Прыгоды Сіндбада».
15.20 «Саюзнікі».
15.55 «Білет на сёння».
16.05, 3.50 «Гадзіна суда. Справы сямейныя».
17.05 Серыял «Каханне як каханне».
18.20 Акцэнты.
18.30 Серыял «Я не вярнуся».
20.05 «Слова за слова».
21.20, 2.50 Серыял «Прызванне».
22.20 «Свет спорту».
23.15 Дак. фільм «Кома гэта праўда».

7.00, 10.50 Навіны кіно.
7.10 «На рыбалку з Юрыем Заслаўскім».
7.25 «Метэапрагноз».
7.30 Серыял «Невідзімка».
9.00 «Клуб-700».
9.30 «К-відэа» для дзяцей.
9.50, 19.45 Серыял «Салодкі плод».
11.00 Серыял «Сям'я Кардзье».
12.45 «8 самых».
13.00 «Дзённы тэлечат».
16.30 Мультпарад.
16.50 «Ін-фармацыя».
17.00 Серыял «Свавольнікі».
17.30 Серыял «Лейтэнант Каломба».
19.15 «Мой любімы гадаванец».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «К-відэа» для ўсёй сям'і.
21.05 Інфармбюро «Міжнароднае».
21.10, 23.35 Астра-, метэапрагноз.
21.15 Баявік «Зорны дэсант».
23.15 «Стары магнітафон».

7.00 Добрай раніцы, Расія!
9.30 «Парадок».
10.30 «Ранішняя пошта» з Юрыем Нікалаевым і Ларысай Грыбалёвай.
11.00, 14.00, 17.00, 19.00 Весткі.
11.25 Пакой смеху.
12.25 Маст. фільм «Казацкая застава».
13.50, 16.50, 18.50, 23.30 Навіны—Беларусь.
14.20, 22.35 «Кулагін і партнёры».
14.55 «Двое». Андрэй Мягкоў і Настасся Вазнясенская. Дак. фільм.
15.45 «Анёл-ахоўнік Віталя Саломіна». Дак. фільм.
17.25 «Сумленны дэтэктыў».
17.55 Серыял «Лэдзі Бомж».
19.30 Серыял «Кармеліта».
20.30 Серыял «Жыццё, якога не было...».
21.30 Серыял «Трое супраць усіх».
23.10 «Весткі+».
23.40 «Гуд бай, Амерыка. Кампазітар Зацэпін». Дак. фільм.

7.00 Добрай раніцы, Расія!
10.00, 17.30, 0.25 Серыял «Родныя людзі».
10.45, 18.15, 1.10 Серыял «Лэдзі Бос».
11.25, 14.45 Мультфільмы.
11.35 Маст. фільм «Чартар».
13.00, 16.00, 19.00, 3.00 Весткі.
13.20 Весткі—Масква.
13.35 Маст. фільм «Расстанемся — пакуль добрыя». 1-я серыя.
15.15 «...Чтоб каждую строку прожить собой...» Міхаіл Луконін.
16.20 Весткі—Маскоўская вобласць.
16.45, 0.10, 6.40 Весткі—спорт.
17.00, 5.40 «Скразное дзянне».
19.45, 1.55 Серыял «Кармеліта».
20.30, 3.45 Серыял «Жыццё, якога не было...».
21.15, 5.40 «Піраты XXI стагоддзя».
22.00 Весткі—Санкт-Пецярбург.
22.20 «Астравы». Валерый Прыёмыхаў.
23.00, 4.30 «Весткі+».
23.20, 2.40 Навіны культуры.
23.40, 6.10 «Апраўданне Гаэля». «Рускі чыста анекдот».

6.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00 Сёння.
6.05 «Сёння раніцай».
9.00 «Сёння. Падагульняючая праграма».
10.25 «Кулінарны паядынак».
11.15 «Кватэрнае пытанне».
12.15 «Следства вялі...».
13.40 Серыял «Вяртанне Мухтара».
15.10 «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
15.30, 18.30 «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
16.30 Серыял «Угро».
19.40 Серыял «Ліцейны, 4».
21.35 «Сумленны панядзелак».
22.35 «Ты не павераныш! Ньюс».
23.25 Серыял «Чорны снег».
0.20 Серыял «Турма асобага прызначэння».
1.05 «Школа зласлоўя».

7.10 Канал «Настрой».
9.25 «Гісторыя дзяржавы Расійскай».
9.30, 18.30, 2.50 Серыял «Трымай мяне мацней».
10.15, 19.15 Мультфільм.
10.30, 13.30, 16.30, 19.30 Падзеі.
10.45 Маст. фільм «Іпадром».
12.15, 3.35 «Непрыручаная прырода Афрыкі».
12.45, 20.05 Серыял «Родныя людзі».
13.45 «Пастскрыптум».
14.45 «Мёртвая пятля». Спецыяльны рэпартаж.
15.00, 6.00 Серыял «Жонка Іуды».
15.50 «Геній Месца».
16.50, 1.50 Серыял «Інспектар Дэрык».
17.50 «Нас чакае халодная зіма». Фільм Леаніда Млечына.
20.50 «Лінія абароны».
21.25 «Рэпарцёр».
21.45, 4.10 Серыял «Паварот ключа».
22.30 «Момант ісціны».
23.10 Маст. фільм «Кацька і Шыз».
0.40 Падзеі. 25-я гадзіна.
1.10 «Нічога асабістага».
4.00 «Энцыклапедыя». Мантэсума II.
4.55 «Pop Corn-TV».

9.30, 14.30 Снукер.
12.30 Агляд снежнага ўік-энда.
13.00 Біятлон. Кубак свету.
17.30, 0.30 Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету-2010.
18.00 Тэніс. Турнір WTA.
21.55 Вось гэта дзіва!!!
22.00 Пра рэстлінг.
23.30 Баявыя майстэрствы.
1.30 Лёгкая атлетыка.

11.00 ФІЛЬМ ДНЯ

«ДАРОГА ДА ДОМА» (ПАЎДНЁВАЯ КАРЭЯ, 2002 г.)

Тонкі, вельмі чуллівы, шчымлівы фільм... Гэта самы незвычайны, але самы выдатны ў сучасным кінематографе саюз двух людзей, раздзеленых па часе 70-ю гадамі жыцця, прымушае перажываць практычна над кожным кадрам.

Рэжысёр — Лі Юнг-Хянг. **У ролях:** Кім Юл-Бун, Ю Сеунг-Хо, Донг Хе-Хі, Мін Кюнг-Хян, Йім Еун-Кюнг.

АЎТОРАК, 31 САКАВІКА

6.00, 7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55 Навіны.
6.02, 7.05 Прэс-агляд.
6.05, 1.15 Дзень спорту.
6.15, 7.10, 8.10 «Добрай раніцы, Беларусь!».
6.45, 7.45, 18.50, 1.10 Зона Х.
7.30, 8.30, 11.50 Дзелавое жыццё.
8.20 Гатуем разам.
8.35 Арэна.
9.05, 13.55 «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
9.10, 19.55 Серыял «Монтэкрыста».
10.05, 16.55 Серыял «Гарачы лёд».
10.50, 17.50 Серыял «Родныя людзі».
11.40 «Зямля беларуская». «Таямніцы зямлі Обраў».
12.10 Гульнявое шоу «Інтуіцыя».
13.05 Серыял «Монк».
14.05 Ток-шоу «Ход у адказ».
15.15, 19.20 Навіны рэгіёна.
15.25 Дак. цыкл «Нябачны фронт».
16.05 Серыял «Два лёсы».
19.30 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
21.50 «Па-за законам». «Асоба ўстаноўлена».
22.20, 1.25 Серыял «Доктар Хаўс».
23.25 Камедыя «Амерыканская кухня».

6.00, 6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 22.55, 0.50 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Чакай мяне».
9.55 «Іронія лёсу Сяргея Бязрукава».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.10, 1.05 Навіны спорту.
11.10 «Адзін супраць усіх».
12.00 «Малахаў+».
13.10 «Зразумець. Дараваць».
13.45 «Модны прыгавор».
15.00 Серыял «Гарачы лёд».
16.15 Серыял «Агонь кахання».
17.10 «Няхай гавораць».
18.20 Серыял «Хто ў доме гаспадар?».
18.55 Серыял «Рыжая».
20.00 Час.
